Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

8 ЛІПЕНЯ 2017 г. СУБОТА №129 (28493)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Сэрца дзяўчыны належыць футболу

СТАР. 5



Класічная музыка ў фармаце open air

СТАР. 12



Рускі тэатр — пра падводнікаў

СТАР. 13

# Ой, рана на Івана



**Жыхары пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна ахвотна прымаюць удзел у летнім народным свяце Купалле. Гэтым разам па традыцыі моладзь, сямейныя пары, хлопчыкі і дзяўчаткі школьнага ўзросту сабраліся за ваколіцай населенага пункта, на беразе Дзвіносы, каб патанцаваць і павадзіць карагод вакол вогнішча (а яно было велізарнае), паўдзельнічаць у конкурсах, пашукаць «папараць-кветку» і за гэта атрымаць... прызы. Вядома, без работнікаў гарадскога Дома культуры святочны вечар не быў бы такім маляўнічым, вясёлым і таямнічым.**

**Поўную версію фотарэпартажу глядзіце на сайце *zviazda.by***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**6,561 млрд долараў**

*у эквіваленце склалі, па папярэдніх звестках, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў міжнародным вызначэнні на 1 ліпеня 2017 года. За чэрвень ЗВР выраслі адразу на 1,322 млрд долараў, або на 25,2%, пасля росту ў маі на 0,13 млрд долараў (на 2,5%). Па выніках першага паўгоддзя 2017 года прырост рэзерваў склаў 1,634 млрд долараў (33,1%). Асноўным фактарам значнага росту ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў за месяц стала паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў еўрааблігацый на суму каля 1,4 млрд долараў, а таксама атрыманне Беларуссю чацвёртага траншу фінансавага крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця ў аб'ёме 300 млн долараў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9731 | ▲ |
| Еўра | 2,2532 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0757 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Без абмежаванняў

## ПУДРА, АКУЛЯРЫ І МЕНЮ ПА БРАЙЛЮ

### Як невідушчыя беларусы вучацца асновам макіяжу і сталоваму этыкету

**Як зразумець, які з відэльцаў закусачны, калі не бачыш? Ці нанесці румяны навобмацак? Мінскі Цэнтр паспяховага чалавека арганізаваў для невідушчых курс па сацыяльнай рэабілітацыі, дзе іх вучылі не толькі арыентавацца з дапамогай белага кійка і карыстацца камп'ютарам, але і рабіць макіяж, танцаваць і разбірацца ў тонкасцях сталовага этыкету. На некаторых занятках пабывалі і мы.**

### НАФАРБАВАЦЦА ЗА 10 ХВІЛІН



Звычайна на курсах па візажы стол ломіцца ад касметыкі: алоўкі для вачэй, рознакаляровыя цені, падводкі, хайлайтары... Але не ў гэтым выпадку. Дэкаратыўных сродкаў тут выкарыстоўваюць мінімум.

— Сутнасць курсаў — навучыць дзяўчат рабіць звычайны дзённы макіяж, — тлумачыць цырульнік Марына Міцкевіч. — Наносім касметыку навобмацак. З рассыпчатай пудрай прасцей за ўсё працаваць. Пасля заняткаў я дапамагаю падабраць пэндзлік і тон. Вучу наносіць румяны. Як? Знаходзім выступаючую костачку на шчацэ, стаўлю палец да гэтай кропкі і ад вуха вядзём да яе лінію. А тушшу дзяўчаты рэдка карыстаюцца. Бо калі сляза пацячэ, не змогуць выцерці акуратна — размажуць. Да таго ж многія носяць цёмныя акуляры.

Насупраць сядзіць адзінаццацікласніца Ксенія Сачанка. На курсы рэабілітацыі яна прыехала з аграгарадка Старабарысаў Барысаўскага раёна. Раней, прызнаецца, касметыкай самастойна не карысталася, па святах яе фарбавалі аднакласніцы. Цяпер Ксюша і сама можа справіцца: на макіяж у яе ідзе хвілін дзесяць.

СТАР. 4

■ Гэта па-нашаму!

## ЯК СІЁРЫ СТАЛА ЗОСЯЙ,

### або Навошта замежнікі вывучаюць беларускую мову?

**На пачатку лета ў Кіеве я зусім выпадкова пазнаёмілася з украінцам, які выдатна валодае беларускай мовай. Малады чалавек у вышыванцы сам падышоў да нас з мужам і сказаў «Прывітанне». Я, вядома, спачатку вельмі здзівілася. Але Міхась растлумачыў, што проста ўбачыў на нашых майках беларускамоўныя надпісы ды арнамент і адразу ж зразумеў, што мы з Беларусі.**

Што цікава, нават у сацыяльных сетках украінец зарэгістраваўся па-беларуску, як Міхась Мінчэнка. Кажа, у любімы Мінск стараецца завітаць як мінімум раз на год. Летась ён вучыўся тут разам з іншымі замежнікамі ў міжнароднай школе беларусістыкі. Сёлета таксама падаваў заяўку. Але, на жаль, ахвотных было больш, чым месцаў, таму перавагу аддавалі новенькім. Тым не менш Міхась усё адно на днях прыехаў у Беларусь, каб пабачыцца са сваімі беларускамоўнымі сябрамі, папрактыкаваць мову з носьбітамі.

У Кіеве хлопец з задавальненнем наведвае гурток, дзе аматары беларушчыны, якія жывуць ва Украіне, глядзяць фільмы, слухаюць песні, чытаюць кнігі ды камунікуюць на беларускай мове. Міхась прызнаўся, што яшчэ не прапусціў ні адну тэматычную імпрэзу. На маё пытанне — «Навошта вывучаеш беларускую?» — не раздумваючы адказвае: «Бо яна мне вельмі падабаецца. За што? Цяжка сказаць. Гэта як каханне. Кахаеш дзяўчыну, а за што, не ведаеш. Я, як і вы, з задавальненнем нашу вышыванку, пояс з арнаментам, майку з надпісам «Беларусь». Калі людзі бачаць мяне ў такім адзенні, адразу разумеюць, што да мяне варта звяртацца па-беларуску». Міхась прызнаўся, што марыць арганізаваць моўныя курсы для ўкраінцаў, накшталт «Мова нанова».

СТАР. 4

# АД СТАЛІЦЫ ДА ВЁСКІ

## Прэзідэнт агучыў, якім чынам будуць развівацца населеныя пункты ўсіх узроўняў

**Справа ад аўтамабільнай дарогі — поле льну. Дасканала роўна пасаджанае, яно нагадвае зялёны дыван з блакітным адценнем. Яно нараджае адчуванне чысціні, дагледжанасці і дасканаласці, якое не пакідае на працягу ўсяго шляху да гарадскога пасёлка Копысь і ў ім самім.**

Мясцовая жыхарка Таццяна Чарнюк прызнаецца, што за апошнія гады Копысь змянілася ў лепшы бок. Палепшыліся інфраструктура, знешні выгляд. «Такую прыгажуню зрабілі! — кажа яна. — Але тое, што зроблена, трэба берагчы».

Жыхары гарадскога пасёлка, якія прыйшлі на сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, у адзін голас кажуць, што родную Копысь не пазнаць. За лічаныя месяцы паклалі новае дарожнае пакрыццё, праклалі сеці вода-, газа- і электразабеспячэння, а таксама сувязі. Цяпер ідуць работы па рэканструкцыі дзіцячага садка, школы, бальніцы. Па словах беларускага лідара, Копысь можа стаць прыкладам таго, як варта ўдыхаць новае жыццё ў невялікія населеныя пункты:

— Я хацеў паглядзець, як выканана маё даручэнне. Мы прынялі рашэнне восенню мінулага года аднавіць гэты гарадскі пасёлак. Не таму, што дзесьці я хадзіў па гэтым пасёлку, хаця тут няма таго метра, дзе б я ні хадзіў, ды і нарадзіўся тут. Пытанне глыбейшае. Перад намі стаіць праблема, як далей развіваць краіну, як яе засяляць, дзе павінны жыць людзі.

Камфорт павінен быць не толькі ў буйных гарадах, але і ў невялікіх паселішчах. Трэба стварыць добрыя ўмовы, не разбураючы тое, што ўжо ёсць. Пры гэтым людзям важна мець годную працу.

Па словах Прэзідэнта, родны для яго пасёлак быў абраны не выпадкова: тут усё яму вядома, тут не падманеш, спрацаваўшы дрэнна.

— Мы зрабілі адзін пасёлак. Усіх губернатараў сюды прывязём. З наступнага года ў кожнай вобласці два пасёлкі кожны год дастань і пакладзі. Менавіта так, як у Копысі, мы іх павінны прывесці ў парадак. Так мы замыкаем вертыкаль аднаўлення краіны, пра якую я казаў: Мінск, абласныя цэнтры, раённыя цэнтры (яны ўсе ў парадку, нават у Віцебскай вобласці), ніжэй ідзе аграгарадок (таксама ведаем, як рабіць), далей ідуць пасёлкі гарадскога тыпу і вёскі, дзе раней былі цэнтры аб'яднаных гаспадарак.

Прэзідэнт азнаёміўся з аднаўленымі аб'ектамі ў пасёлку, наведаў цэнтр народнай творчасці, бальніцу, добраўпарадкаваны бераг Дняпра. Асобную частку ў паездцы заняла гутарка з мясцовымі жыхарамі.

Адно з пытанняў датычылася коштаў на лекі, якія «пастаянна растуць». У сваю чаргу, кіраўнік дзяржавы запэўніў жанчыну, што раз такая праблема сапраўды хвалюе людзей, цэны на лекавым рынку будуць дадаткова правераны. «Вы ведаеце маё стаўленне. Наколькі магчыма сёння, я імкнуся стрымліваць цэны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым калі шэсць гадоў таму ў Беларусі рабілі толькі 18% лекаў ад усіх, якія прысутнічалі на рынку, то цяпер — 56—57%, і пры гэтым большасць з іх каштуе каля аднаго-двух долараў.

Маладая маці падзялілася сваімі ўражаннямі ад парада ў Мінску, які глядзела па тэлебачанні разам са сваім трохгадовым сынам, і запытала, ці спадабаўся ён Прэзідэнту. «У цэлым мне парад спадабаўся. Зрабілі ўжо больш маштабна, — сказаў ён. — Я прасіў, каб паказалі моц арміі, каб людзі паглядзелі і зрабілі высновы, што там штосьці ёсць, што можа іх абараніць. І іх дзяцей, і вашага трохгадовага малыша».

Галіна Куляшова запыталася ў Прэзідэнта, ці будзе ў гэтым годзе наша краіна з хлебам, нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што год гэты для сельскай гаспадаркі неблагі: збожжавыя, сапраўды, невысокія, бо было халаднавата, але затое добра развілася каранёвая сістэма. Слабыя былі травы першага ўкосу, асабліва злакавыя, але зараз, пасля таго як прайшлі дажджы, трава стала лепшая.

— На працягу тыдня я вам абяцаю спёку да 30 градусаў. Мы чакаем моцны паўднёвы цыклон. І яшчэ надакучыць. Маё асабістае меркаванне, я ўжо казаў, я — чалавек зімні. Для мяне гэта благадаць. Гэта надвор'е — маё надвор'е. Я адчуваю сябе камфортна. Давайце будзем бліжэй да Госпада, і ён нам падорыць добрае надвор'е. Тое, якое кожны з вас чакае.

**Вераніка ПУСТАВІТ,**
*pustavit@zviazda.by*
*г. п. Копысь.*

# ЗГОДА БУДУЕ

## ...кажуць беларусы. У Мінску працягваецца дыялог паміж парламентарыямі амаль 60 краін свету

**Учора ўдзельнікі пасяджэнняў 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ працягнулі разгляд асноўных пытанняў парадку дня. Нашы карэспандэнты інфармуюць пра найбольш цікавыя моманты сустрэч.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### АДКАЗ ТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ПАГРОЗЕ

На пасяджэнні Агульнага камітэта па палітычных пытаннях і бяспецы абмеркавалі папраўкі да праекта рэзалюцыі і дадатковыя пытанні. Асноўнай тэмай стаў тэрарызм. Прадстаўнік Таджыкістана адзначыў, што для супрацьстаяння гэтай сусветнай праблеме неабходны калектыўны падыход. Магчыма, трэба выпрацаваць на заканадаўчай аснове новыя падыходы, накіраваныя ў тым ліку на прадухіленне.

Прадстаўнік Грэцыі падкрэсліў, што абсалютны прыярытэт для грамадзян — бяспека, якую гарантуе дзяржава. У гэтым кірунку парламентарыі могуць зрабіць наступнае: па-першае, узгадніць заканадаўства па барацьбе з тэрарызмам, па-другое, наладзіць супрацоўніцтва паміж арганізацыямі бяспекі.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў Пірштук прапанаваў падтрымаць прапанову расійскай дэлегацыі — праект рэзалюцыі аб умацаванні ролі АБСЕ ў супрацьдзеянні




тэрарызму: «Вітаем прыняцце ў Мінску рашэння аб заснаванні ў рамках ПА АБСЕ Камітэта па супрацьдзеянні тэрарызму. Упэўненыя, што яго работа будзе спрыяць узмацненню ўкладу нашай асамблеі ў барацьбу з гэтай чумой XXI стагоддзя, ахвярамі якой за апошнія гады сталі многія тысячы нявінных людзей па ўсім свеце».

### ГУМАНІТАРНЫ АСПЕКТ

На пасяджэнні Агульнага камітэта па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях прадстаўнік Канады падняла пытанне аб дыскрымінацыі на рэлігійнай глебе. Яна адзначыла, у прыватнасці, што распаўсюджанне тэрарызму ўплывае на адносіны да мусульман па ўсім свеце. У сваіх прапановах па ўдасканаленні рэзалюцыі дэлегаты звярталіся ў асноўным да традыцыйных каштоўнасцяў: свабоды слова і іншых правоў чалавека.

### ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ПАРАЗУМЕННЯ

На пасяджэнні Агульнага камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі абмяркоўвалі магчымасць унясення 20 папраўак да праекта будучай Мінскай дэкларацыі. Парламентарыі прынялі ініцыяваную беларусамі 19-ю папраўку, якая мае на ўвазе ўключэнне пункта аб неабходнасці далейшага развіцця і пашырэння ўзаемадзеяння паміж інтэграцыйнымі працэсамі і структурамі на прасторы АБСЕ ў інтарэсах фарміравання адзінай эканамічнай прасторы. Робіцца гэта ў адпаведнасці з абавязацельствамі, якія замацаваны ў Хельсінкскім заключным акце і Астанінскай юбілейнай дэкларацыі 2010 года. Пры гэтым асаблівае месца аддаецца менавіта АБСЕ: арганізацыя магла б адыгрываць ролю платформы для дыялогу. Беларуская папраўка нацэлена на тое, што дадзеную практыку неабходна спрасціць, у тым ліку на лініі міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва.

Важнай падзеяй таксама стала прыняцце беларускай рэзалюцыі аб «Распрацоўцы своечасовых і эфектыўных заканадаўчых, нарматыўных, адміністрацыйных мер рэагавання на з'яўленне новых псіхаактыўных рэчываў». Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў Пірштук пасля прадстаўлення рэзалюцыі адзначыў, што выпрацаваць агульныя аператыўныя падыходы рэагавання будзе няпроста. Але прыняцце рэзалюцыі большасцю галасоў кажа пра тое, што тэма актуальная і вельмі важная для ўсёй прасторы АБСЕ.

Акрамя таго, ён звярнуў увагу на тое, што за апошнія два-тры гады колькасць людзей, якія прымаюць псіхаактыўныя рэчывы, павялічылася ўдвая. Гэта пацвярджаюць эксперты ААН і АБСЕ. На яго думку, выявіць такія рэчывы складана, таму што іх цяжка зарэгістраваць. Гэта адбываецца таму, што яны хутка з'яўляюцца, а выяўляць іх не паспяваюць. Гэты працэс трэба папярэджваць, лічыць віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента.

Баляслаў Пірштук таксама адзначыў, што Беларусь гатова прымаць актыўны ўдзел у дзейнасці АБСЕ. «Нам хацелася б больш працаваць менавіта ў эканамічным блоку, каб мы дзейнічалі эфектыўней у рэчышчы АБСЕ, у Еўрасаюзе, прыцягвалі і патэнцыяльных інвестараў, і новыя тэхналогіі», — рэзюмаваў беларускі дакладчык.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*
**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Межы для наркотыкаў

# НЕКАЛЬКІ МЕР, КАБ ЗНІЗІЦЬ ПОПЫТ

## Нарада галоўных нарколагаў дзяржаў — членаў АДКБ прайшла ў Мінску

**Галоўныя нарколагі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, а таксама прадстаўнікі рэгіянальнага офіса ўпраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці па Афганістане і суседніх краінах чарговы раз абмеркавалі сітуацыю з ужываннем наркотыкаў і новых псіхаактыўных рэчываў у краінах — членах Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, падзяліліся вопытам работы па лячэнні, рэабілітацыі і рэсацыялізацыі нарказалежных, вызначылі эфектыўныя меры прафілактыкі.**

Дагэтуль у межах Дагавора аб калектыўнай бяспецы шмат гадоў распрацоўваліся ў першую чаргу механізмы сілавога, праваахоўнага процідзеяння незаконнаму абароту, што, безумоўна, прынесла свой плён. Дастаткова прыгадаць хоць бы адну з апошніх маштабных аперацый «Заходні заслон» (са штабам у Брэсце), падчас якой дзяржавамі — членамі АДКБ з прыцягненнем іншых краін было канфіскавана каля 16 тон наркотыкаў. Аднак барацьба з псіхаактыўнымі рэчывамі патрабуе эфектыўных мер процістаяння не толькі прапанове, але і попыту. Цікавым вопытам работы дзеліцца ў гэтым кірунку, напрыклад, расійскі бок.

— Даволі доўга мы даказвалі неабходнасць ранняга выяўлення спажыўцоў наркотыкаў у адукацыйным асяроддзі, і ўрэшце быў распрацаваны адпаведны закон, і цяпер мы актыўна тэсціруем школьнікаў і студэнтаў, — паведаміў **галоўны пазаштатны псіхіятр-нарколаг Міністэрства аховы здароўя Расіі Яўген БРУН.** — Калі 5—6 гадоў таму ўзровень спажывання наркотыкаў сярод апытанных старшакласнікаў і студэнтаў набліжаўся да 10—15 працэнтаў, то летась размова ішла пра 3 працэнты, а дзесьці і менш. Надалей мы будзем займацца выяўленнем спажыўцоў наркотыкаў і алкаголю ў кардыялагічных, пульманалагічных, гастраэнтэралагічных аддзяленнях бальніц. Паводле першых вынікаў, каля 15 працэнтаў пацыентаў гэтых аддзяленняў атрымалі свае захворванні менавіта з прычыны злоўжывання псіхаактыўнымі рэчывамі. Плануецца ў нас працягваць і прафілактыку на працоўных месцах: у мужчынскіх працоўных калектывах выяўляецца да 20 працэнтаў праблемных людзей...

Гэтыя падыходы Расія прапануе і краінам — удзельніцам АДКБ. З 2014 года Беларусь таксама выяўляе ў арганізаваных калектывах грамадзян, схільных да ўжывання псіхаактыўных рэчываў. У тым жа годзе Міністэрства аховы здароўя распрацавала метадычныя рэкамендацыі па выяўленні наймальнікамі ў сваіх працоўных калектывах асоб, якія злоўжываюць або маюць такую схільнасць, нагадвае **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Іван КАНАРАЗАЎ.** Прапісаны ў рэкамендацыях і шляхі вырашэння праблемы — куды звяртацца па наркалагічную дапамогу. Плануецца ў краіне праводзіць і даследаванне па выяўленні схільных да злоўжывання алкаголем у саматычных стацыянарах. Своечасовае выяўленне згубнай схільнасці дапамагае ажыццявіць індывідуальную прафілактыку ў групах рызыкі. Аб эфектыўнасці падобных мер сведчыць, напрыклад, той факт, што за апошнія 4—5 гадоў колькасць траўмаваных на вытворчасці знізілася прыкладна ўдвая.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## Дзеля памяці

# КУПАЛА, ТЫ І СЁННЯ З НАМІ!



**Дзень нараджэння Янкі Купалы, які ўчора адзначалі па ўсёй краіне і яшчэ працягваюць святкаваць, у беларускай сталіцы атрымаўся надзвычай урачыстым. Не толькі афіцыйныя асобы і культурныя дзеячы, прадстаўнікі дыпламатычных місій прынеслі кветкі да помніка Купалы, які знаходзіцца ў парку, што носіць яго імя. Адметна і тое, што шмат іншых, па-свойму ўлюбёных у песняра людзей, неслі яму свае ружы, гваздзікі, званочкі і лілеі... І кожны імкнуўся пакланіцца выяве Купалы. Нібы роднаму. Нібы і сёння жывому.**

Адметна, што такія юбілеі, як 135-годдзе першага народнага паэта, яднаюць увесь наш народ. **Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ** зачытаў віншавальнае слова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, а таксама падзяліўся ўласнымі думкамі пра песняра:

— Памяць пра паэта, яго ўнёсак у станаўленне беларускай літаратуры неацэнныя. У любой культуры павінны быць пункты, на якія можна абапірацца. Ёсць матэрыяльныя выявы — помнікі, замкі, — але ёсць і нематэрыяльная спадчына, у якой таксама маюцца астраўкі і архіпелагі. І вось такой магутнай выспай акурат з'яўляецца творчасць Янкі Купалы... Асабіста я нарадзіўся і жыў зусім побач з музеем Янкі Купалы ў Мінску. Таму з матуляй, бабуляй я гуляў менавіта ў Купалаўскім парку і менавіта гэты музей, натуральна, наведаў першым у сваім жыцці. У больш сталыя гады я зразумеў паэта як чалавека з вельмі шырокім, асаблівым светапоглядам. Гэта класік, якога я з задавальненнем перачытваю.

Праявы таленту песняра прынеслі славу нашай Бацькаўшчыне. Яны зрабіліся не сімваламі на радзіме і ў свеце. Творчасць Купалы стала сапраўдным арыенцірам для многіх пакаленняў. Можна сказаць, ён з'яўляецца прарокам нацыянальнага адраджэння. Кожнае слова Янкі Купалы — паэта, драматурга, публіцыста — служыла станаўленню культурнай і дзяржаўнай ідэнтычнасці роднага краю.

**Дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКЕВІЧ** адзначае:

— Іван Дамінікавіч далучыў беларускую літаратуру да сусветнай. Яго паэзія перакладзена амаль на 100 моў. Адзін толькі верш «А хто там ідзе?» гучыць сёння на 85 мовах свету. Дзякуючы яго творам нас ведаюць у многіх кутках зямлі. Адметна, што Беларусь здолела захаваць памяць пра свайго слаўнага сына. І пачалося гэта яшчэ пры жыцці паэта, у 1926 годзе, калі дзве школы, у Полацку і Мазыры, атрымалі імя Янкі Купалы. Упершыню па-за межамі нашай краіны імя Янкі Купалы таксама было ўшанавана яшчэ пры яго жыцці. У 1932-м у далёкім бразільскім горадзе Порту-Алегры імя Янкі Купалы было нададзена публічнай бібліятэцы. І зроблена гэта было дзякуючы намаганням беларуска-ўкраінскай дыяспары.

Наша краіна ўдзяляе вялікую ўвагу ўшанаванню памяці песняра, упэўнена Алена Ляшкевіч. Сёння ў Мінску ёсць парк імя Янкі Купалы, вуліца, драматычны тэатр, Інстытут мовазнаўства, бібліятэка, школа №19 носяць яго імя. Амаль у кожным раённым і абласным цэнтры ёсць вуліцы, плошчы, скверы, школы, бібліятэкі імя Янкі Купалы. Ужо 83 гады існуе літаратурны музей Янкі Купалы, дзе не толькі захоўваюць спадчыну паэта, але і далучаюць да яе новыя пакаленні.



**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

## АДЧУЦЬ ДАПАМОГУ

**На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый. Сёння, 8 ліпеня, з 9.00 да 12.00 на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — старшыня Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам** — намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам** — першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам** — старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

## Дэкрэт №3

# Прынясіце даведку з работы

### Тым, хто заплаціў падатак на ўтрыманства паводле Дэкрэта №3, пачалі вяртаць грошы

**Збор за 2015 год вяртаюць тым, хто ўладкаваўся на працу. Пра гэта расказала намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА.**

Такое даручэнне было дадзена Прэзідэнтам яшчэ падчас нарады 9 сакавіка. Тады ж было вырашана да канца года не спаганяць падатак на фінансаванне дзяржвыдаткаў.

Колькім грамадзянам ужо вярнулі збор, сказаць складана. «Распараджэнне толькі прынята, і мы літаральна днямі прыступілі да работы», — растлумачыла Святлана Шаўчэнка. Для таго каб вярнуць грошы, неабходна звяртацца ў мясцовыя падатковыя органы.

Цяпер міжведамасная працоўная група пры Савеце Міністраў падрыхтавала новую канцэпцыю Дэкрэта №3 і прадставіла яе на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта. Сярод асноўных кірункаў — садзейнічанне занятасці і выкананне комплексу мер, каб задзейнічаць у эканоміцы асоб, што вядуць асацыяльны лад жыцця.

Намеснік міністра заўважыла, што ёсць катэгорыя грамадзян, якія свядома ўхіляюцца ад падаткаў. Таму ведамства лічыць неабходным ствараць такія ўмовы, калі б людзям было выгадна выконваць свае падатковыя абавязкі. Напрыклад, мяркуецца пашырыць пералік дзейнасці, якая адносіцца да рамесніцкай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## На слыху

# МЕТАЛ «ГРЭЕ» РУКІ?

**Днямі ў Мінску на месцы злачынства быў затрыманы намеснік генеральнага дырэктара па фінансавай і эканамічнай палітыцы ААТ «БелАЗ». Наручнікі на яго надзелі падчас атрымання хабару ў 1200 долараў ЗША ад прадстаўніка сталічнай камерцыйнай структуры. Грошы прызначаліся ў якасці «платы» за спрыяльнае вырашэнне пытання аб першачарговай аплаце за пастаўленую на БелАЗ партыю металу.**

— Да таго ж 5 ліпеня былі затрыманы начальнік бюро і эканаміст ААТ «БелАЗ», — паведаміў **часова выконваючы абавязкі начальніка Упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Рыгор ЕЎЧАР.** — Устаноўлена, што з 8 чэрвеня па 4 ліпеня яны таксама атрымлівалі хабар ад прадстаўнікоў гэтай жа фірмы. «Падзяка» прызначалася за станоўчае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавораў на пастаўку металу. Аказалася, што гэтая незаконная схема дзейнічала ад мінулай восені. Метал для «БелАЗа» закупаўся па коштах, якія перавышалі рынкавыя. А прадстаўнікі прадпрыемства сістэматычна атрымлівалі хабар, памер якога складаў пэўны працэнт ад сумы пагаднення. У падазраваных, сярод якіх і трое прадстаўнікоў камерцыйнай структуры, арыштавана маёмасць — шэсць аўтамабіляў прэміум-класа, грашовыя сродкі і каштоўнасці, а таксама 7 аб'ектаў нерухомасці.

Галоўнае следчае ўпраўленне цэнтральнага апарату Следчага камітэта Беларусі распачало крымінальныя справы па артыкулах 430 і 431 Крымінальнага кодэкса (атрыманне і дача хабару адпаведна). Максімальная санкцыя па гэтых артыкулах — 15 і 7 гадоў пазбаўлення волі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## Сезон

# Пачынаецца паляванне на бакаса

**Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, яно будзе дойдзецца ў краіне з першай суботы ліпеня (сёлета гэта 8-е чысло) да першай суботы жніўня (12-е).**



Здабываць птушыную дзічыну можна любога полу і ўзросту. Паляваць дазваляецца толькі ў светлы час сутак. Спосаб — зброевы з падыходу толькі з паляўнічымі сабакамі. Дазволеныя прылады — гладкаствольная паляўнічая зброя з выкарыстаннем патронаў са шротам, паляўнічыя сабакі — выжлы, спаніэлі, рэтрыверы. Бакас — адзін з найбольш шматлікіх відаў птушак, якія сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі. Птушка жыве на пойменных лугах, балотах, забалочаных узлесках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Перамовы пра аб'яднанне Кіпра завяршыліся безвынікова

Шматгадзінныя кансультацыі зноў не прывялі да кампрамісу. Анкара хоча захаваць частку ваеннага кантынгенту на поўначы Кіпра і свой статус дзяржавы-гаранта, грэкі і кіпрыёты — супраць.

Кансультацыі пачаліся ў першай палове дня чацвярга і скончыліся толькі а трэцяй гадзіне раніцы ў пятніцу, адзначае агенцтва DPA.

Галоўным каменем спатыкнення на перамовах з'яўляецца сістэма дзяржаў-гарантаў і пытанне вываду турэцкіх ваенных з вострава. Анкара выказала гатоўнасць вывесці большую частку свайго кантынгенту, які цяпер складае 35 тысяч салдат, з непрызнанай міжнароднай супольнасцю Турэцкай Рэспублікі Паўночнага Кіпра. Але пры ўмове, што астатняя частка ваеннага кантынгенту працягне знаходзіцца на востраве як мінімум на працягу 15 гадоў, а Турцыя захавае статус дзяржавы-гаранта. Улады Кіпра і Грэцыі настойвалі на поўным вывадзе турэцкіх войскаў з вострава і заяўлялі, што дзяржавы ЕС не маюць патрэбы ў дзяржавах-гарантах.

Раней сёлета перамовы аб аб'яднанні Кіпра праходзілі ўжо ў студзені і красавіку, але таксама не прынеслі вынікаў.

### Пуцін і Трамп сустрэліся ў Гамбургу



Прэс-сакратар Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Пяскоў паведаміў, што лідары дзвюх дзяржаў сустрэліся ў кулуарах саміту G20.

«Яны паціснулі адзін аднаму рукі і сказалі, што хутка правядуць асобную сустрэчу, што хутка пабачацца», — сказаў Пяскоў.

На перагаворах у выставачным цэнтры Гамбурга ўчора абмяркоўваліся тэмы Сірыі і Украіны, а таксама барацьба з тэрарызмам, пытанні стратэгічнай стабільнасці і двухбаковая праблематыка. Расійскі бок, у прыватнасці, узняў пытанне аб вяртанні Расіі канфіскаваных дыпламатычных дач у штатах Нью-Ёрк і Мэрыленд.

Прэс-сакратар адзначыў, што пры падрыхтоўцы да сустрэчы Пуцін прыняў да ведама заявы Трампа пра нібыта дэстабілізуючы ўплыў Расійскай Федэрацыі, якія той зрабіў напярэдадні ў Польшчы. «Безумоўна, аб усіх заявах спадара Трампа, якія ён рабіў у Польшчы, і іншых афіцыйных асоб з Вашынгтона мы падрабязна дакладвалі Пуціну для яго інфармацыі ў ходзе падрыхтоўкі да меркаванай двухбаковай сустрэчы з Трампам. Пуцін прыняў гэта да ведама», — сказаў Пяскоў.

Ён не стаў даваць ацэнку таму, ці могуць гэтыя словы Трампа сапсаваць атмасферу сустрэчы двух лідараў.

### Тэст на бацькоўства «падарыў» Хуліа Іглесіясу 40-гадовага сына

У славутага іспанскага спевака Хуліа Іглесіяса ёсць 40-гадовы сын Хаўер Сантас. Пра гэта сведчаць вынікі ДНК-тэста, піша газета The Telegraph.

Адвакат Сантаса заявіў, што мужчына збіраецца падаваць іск, каб родная сувязь была прызнана судом.

Адзначаецца, што Сантас дабіваўся прызнання бацькоўства Іглесіяса з 1990-х. Паводле яго слоў, у сярэдзіне 1970-х спявак завёў непрацяглы раман з партугальскай балерынай, калі знаходзіўся ў шлюбе з мадэллю Ісабэль Прэйслер. Іглесіяс адмаўляў родную сувязь з Хаўерам Сантасам.

73-гадовы Хуліа Іглесіяс — адзін з самых паспяховых іспанамоўных выканаўцаў. Ён запісаў каля 50 студыйных альбомаў і прадаў больш за 300 мільёнаў копій пласцінак. Іспанец ажаніўся з Ісабэль Прэйслер у 1971 годзе. Праз восем гадоў яны развяліся. Афіцыйна ў Іглесіяса восем дзяцей, у тым ліку 42-гадовы музыкант і акцёр Энрыке Іглесіяс.

# ПУДРА, АКУЛЯРЫ І МЕНЮ ПА БРАЙЛЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Фарбуйся павольней, не так моцна, каб пудра не разляталася. Памятаеш, што я табе казала? Не бойся лішні раз правесці пэндзлем па твары, каб растушаваць, — падказвае ёй падчас працэсу Марына Міцкевіч.

Марына заўважае, што некаторыя слухачкі фарбуюцца вельмі спрытна. «Раз, два — памаду нанесла. Пальчыкамі ў вугалках выцерла, і ўсё — ідэальны контур. Вось як? Нават я так не магу».

На курсах разбіраюць таксама, якія стрыжкі каму пасуюць. Расказваюць, як на прафесійнай мове растлумачыць цырульніку, што ты хочаш. І дапамагаюць падабраць цёмныя акуляры, якія падкрэсляць рысы твару, а не схаваюць яго.

## «ПРЫНЯСІЦЕ НАМ КЕЛІХІ»

Што рабіць з пенкай на капучына, як паклікаць афіцыянта, калі не бачыш яго, навошта ў кактэйль ставяць дзве трубачкі (аказалася, проста для эстэтыкі) — падчас майстар-класа па сталовым этыкеце пытанні так і сыпаліся.

А для пачатку менеджар банкетнай службы гатэля «Рэнесанс» Андрэй Мілюцін сарыентаваў невідушчых гасцей, дзе якія прыборы ляжаць. Так, бліжэй за ўсё да талеркі — сталовыя: імі ядуць гарачыя стравы. Гэтыя прыборы большыя і цяжэйшыя за закусачныя. Рыбныя відэлец і нож больш плоскія, падобныя да лапатак. Лыжку трэба шукаць паміж сталовым і закусачным нажамі, а прыборы для дэсерту — зверху над талеркай.

— Як складваць прыборы, калі вы ўжо паелі? Савецкі спосаб — скрыжаваць. Але ў Еўропе гэта будзе лічыцца, што вы просіце дабаўкі. Таму калі хочаце, каб посуд прыбралі, відэлец і нож павінны ляжаць на талерцы паралельна адзін аднаму, — інструктуе Андрэй Мілюцін.

Сурвэтку з тканіны кладуць на калені, каб абараніць штаны ці сукенку ад крошак, а каб выцерці рот, выкарыстоўваюць папяровую. Хлеб прынята ламаць па кавалачках, а не адкусваць.

**— А як правільна паклікаць афіцыянта? Мы ж не бачым, дзе ён...**
**— Проста падняць руку. Уявіце, што вы вітаеце некага. І ніякіх пстрычак пальцамі!**



— Лыжачку, якую з кавы вымаеш, куды класці? — пытаецца хтосьці з-за стала.

— На сподак. А чайны пакецік — у піражковую талерку, — адказвае прадстаўнік гатэля.

— А як правільна паклікаць афіцыянта? Мы ж не бачым, дзе ён...

— Проста падняць руку. Уявіце, што вы вітаеце некага. І ніякіх пстрычак пальцамі!

— А калі меню па Брайлю няма, як быць?

— Вы можаце папрасіць афіцыянта зачытаць меню. Гэта яго работа.

— А прынясіце нам розныя келіхі — памацаць...

Праз пару хвілін перад кожным з'яўляецца некалькі відаў шкла. Андрэй Мілюцін расказвае, які з келіхаў для чаго прызначаны і як іх правільна трымаць. Напрыклад, высокі трэба браць падушачкамі пальцаў за ножку. Абхопліваць чашу прынята толькі ў выпадку з келіхам для каньяку: каб цяпло рукі саграваала напой, і ён раскрываў свой водар.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## НІЯКІХ СУПРАВАДЖАЮЧЫХ

Праект «Шлях да поспеху» арганізаваны ўстановай рэабілітацыі інвалідаў па зроку «Цэнтр паспяховага чалавека» пры фінансавай падтрымцы пасольства ЗША ў Беларусі. Занняткі бясплатныя, і на іх запрашаюць невідушчых з розных абласцей краіны.

Канстанцін Халюкоў, напрыклад, са Жлобіна. Ён працуе праграмістам і даўно з камп'ютарамі на «ты», але, прызнаецца, на занятках па тэхналогіях адкрыў для сябе шмат новага. «Аказалася, столькі праграм ёсць, з якімі больш зручна працаваць», — дзяліцца ўражаннямі ён.

Падчас курсаў удзельнікі перасоўваюцца па гарадзе самастойна (толькі ў першыя дні ім дапамагаюць з навігацыяй арганізатары). Пакуль ніхто не губляўся, жартуюць. Быў толькі адзін выпадак, калі мужчына загаварыўся з дзяўчынай у аўтобусе і праехаў свой прыпынак.

— На курсах ёсць жорсткае патрабаванне — ніякіх суправаджаючых, — кажа **спецыяліст па інфармацыйна-адаптыўных тэхналогіях цэнтра Аляксандр СЕВЯРЫН.** — Гэта дрэнна ўплывае: чалавек, які прывык разлічваць толькі на клопат блізкіх, наўрад ці чаму-небудзь навучыцца — ён проста наведвае заняткі. Разумеем, што трэба працаваць і са сваякамі. Бо калі чалавек вяртаецца ў цяплічныя ўмовы, ён забывае тое, чаму тут навучыўся. Мы настройваем на самастойнасць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### АФІЦЫЙНА

**Міхаіл АНТОНЕНКА, дырэктар Цэнтра паспяховага чалавека, намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку:**

— Для людзей, якія будуць удзельнічаць у праекце, мы плануем адкрыць клуб ці нават кавярню і там праводзіць тэматычныя сустрэчы. Цяпер шукаем пляцоўку для гэтага. Маем дамоўленасць аб арганізацыі call-цэнтра на базе нашай установы. За аснову возьмем амерыканскі вопыт. Будзем працаваць з абітурыентамі, іх бацькамі, кансультаваць, у які ўніверсітэт ці каледж можна паступіць. Наладжваем таксама супрацоўніцтва з кампаніяй ЕРАМ. Хадзілі да іх на экскурсію, паказвалі, якімі камп'ютарнымі праграмамі карыстаюцца невідушчыя. Магчыма, ЕРАМ возьмецца рыхтаваць нашых людзей з перспектывай далейшага працаўладкавання. Кампанія будзе падцягваць іх тэхнічны ўзровень, а мы, са свайго боку, — вучыць карыстацца інструментамі для работы з камп'ютарам. Невідушчы чалавек можа смела канкураваць на рынку інтэлектуальнай працы — там, дзе зрок адыгрывае другасную ролю.

# ЯК СІЁРЫ СТАЛА ЗОСЯЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, досвед такі ўжо ёсць. Бясплатны гурток па вывучэнні беларускай мовы для японцаў «Беларуская гутарня» летась зладзіла ў Токіа аспірантка Цукубскага ўніверсітэта Сіёры Кіёсава. Цяпер заняткі часова прыпынены, бо дзяўчына ўвесь свой вольны час прысвячае напісанню кандыдацкай работы (якая, дарэчы, непасрэдна звязаная з беларускай мовай). Але ў будучыні яна хацела б аднавіць курсы.

Пазалетась Сіёры наведвала заняткі ў школе беларусістыкі. Сёлета ж вывучаць беларускую мову і культуру ў Мінск прыехалі ажно тры хлопцы з Японіі. «У Японіі не толькі я адна ведаю беларускую мову. Да нас на заняткі ў «Беларускую гутарню» хадзіў магістрант, дык ён напісаў сваю дысертацыю пра гісторыю Беларусі. Яшчэ адзін мой знаёмы японец, як і я ў свой час, стажыраваўся ў Мінску. Ён зацікавіўся беларускай літаратурай і перакладае творы Багдановіча на японскую мову».

— А якія творы беларускай літаратуры найбольш падабаюцца табе?

— Адказаць на гэтае пытанне няпроста, бо насамрэч я яшчэ шмат чаго не чытала і не ведаю. Аднак ёсць адзін верш Рыгора Барадуліна, які мне вельмі падабаецца.

*«Трэба дома бываць часцей,*
*Трэба дома бываць*
*не госцем,*
*Каб душою не ачарсцвець,*
*Каб не страціць*
*святое штосьці».*

З гэтым фрагментам верша Барадуліна ўпершыню пазнаёмілася два гады таму перад вяртаннем у Японію. Ён быў напісаны на сцяне абноўленага мінскага аэрапорта як упрыгажэнне і вельмі мяне ўразіў. Вершаваныя радкі адразу нагадалі мне пра родны дом і бацькоў, якія мяне чакаюць там, у Японіі. Разам з тым мне здалося, што самі радкі ненавязліва, ціхенечка мяне заклікаюць: «Калі ты гэта чытаеш, вяртайся хутчэй у Беларусь, на тваю другую радзіму...» Цяпер я заўсёды ўспамінаю гэты верш перад вяртаннем у Японію ды наадварот — сюды, на Беларусь.

Мне думаецца, што родны дом і родная мова маюць шмат агульных рысаў. І тое і другое дае нам грунт, апірышча, спакой і цяпло ў душы. І тое і другое дае нам магчымасць быць самімі сабой. І галоўнае, што і тое і другое заўжды чакаюць і сустракаюць нас, калі мы часова знаходзімся далёка ад іх. Чула ад многіх беларусаў, што яны не размаўляюць на роднай мове, бо баяцца памыліцца, маўляў, па-руску больш звыкла, бо ўсе на ёй размаўляюць. Для мяне беларуская мова таксама раней была як нейкі бар'ер. Але пасля таго як я пачала вывучаць яе, гэты «бар'ер» паступова змяніўся на «дзверы». Адчыніць іх мне дапамагла паважаная настаўніца, прафесар Таццяна Расціславаўна Рамза. І перада мной разгарнуліся не толькі найцікавейшыя звесткі пра беларускую культуру і гісторыю, але і з'явіліся надзейныя сябры-беларусы і адбылося шмат цікавых знаёмстваў. Цяпер беларуская мова для мяне ўжо амаль як родная, хаця валодаю я ёй яшчэ не зусім свабодна. Прынамсі, яна заўсёды дае мне апірышча, спакой і цяпло ў душы, як родны дом.



Міхась МІНЧЭНКА (злева) падчас тэматычнай імпрэзы ў Кіеве дакранаецца да беларускага абярэга.

***— Сіёры, у сацсетках, я заўважыла, беларускія сябры называюць цябе Зоськай.***

— Зоська — гэта маё беларускае імя, якое я калісьці атрымала на моўных курсах у Беларусі.

***— Навошта ты вывучаеш беларускую мову?***

— Калі я вучылася на першым курсе лінгвістычнага ўніверсітэта, падчас лекцыі выкладчык сказаў, што зараз у свеце існуе больш за шэсць тысяч моў. Але вучоныя кажуць, што 90% з іх вымра ў XXI стагоддзі. Я вельмі здзівілася. Не магла тады ўявіць сабе свет, дзе ніхто не размаўляе на японскай мове, на якой я штодзень думаю і гавару. Пра беларускую я тады яшчэ нічога не ведала...

На яе вывучэнне Сіёры натхніла выкладчыца рускай мовы ў Японіі (зараз навуковы кіраўнік дзяўчыны).

— Яна сказала, што ў Беларусі цікавая моўная сітуацыя. Там жыве шмат беларусаў. Але большасць з іх не размаўляюць на сваёй роднай мове. У 2012 годзе мне пашчасціла паехаць на стажыроўку ў Мінск і вывучаць гэтую мілагучную мову. Спадзяюся, што ў будучым усё зменіцца, і беларусы зразумеюць, які скарб яны маюць.



**Удзельнікі «Беларускай гутарні», якую Сіёры ладзіла для японцаў разам са сваёй сяброўкай з Беларусі (дзяўчаты сядзяць справа ў вышыванках).**

Хвалюе лёс нашай мовы і літоўку Агнэ Шняўкштайце-Бэйнарэне. Дзяўчына, замест таго, каб паехаць у адпачынак на мора, праводзіць яго ў Беларусі. Прыехала сюды на курсы, каб удасканаліць сваё веданне беларускай мовы. Агнэ — гісторык па адукацыі, працуе экскурсаводам у мемарыяльным комплексе ў Тускуленай. Упершыню яна пачула беларускую мову пяць гадоў таму на фольк-фестывалі ў Вільні. Там дзяўчына пазнаёмілася з хлопцамі, якія спявалі ў фальклорным гурце. Адзін з іх і падарыў Агнэ кнігу «Русальная нядзеля. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў». Менавіта гэтая кніга натхніла яе на вывучэнне беларускай мовы. Паўгода яна займалася прыватна з настаўніцай віленскай беларускамоўнай гімназіі. На пытанне, «навошта яна вывучае мову», дзяўчына адказвае: «Нехта мне сказаў, што беларуская — сярод трох еўрапейскіх моў, якія знікнуць першымі. Будзе вельмі шкада, калі так здарыцца. Беларуская мова надзвычай прыгожая. Але чамусьці большасць беларусаў не хоча на ёй размаўляць... Я падумала, што калі вывучу мову, будзе ўжо на аднаго беларускамоўнага чалавека больш».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

# СЭРЦА ДЗЯЎЧЫНЫ НАЛЕЖЫЦЬ... ФУТБОЛУ



**Вы сустракалі ў сваім жыцці футбольнага эксперта — дзяўчыну? Ёсць такая ў Віцебску — Настасся Пішчулава. За пяць гадоў яна сабрала багатую калекцыю атрыбутаў, якія звязаны з «гульнёй мільёнаў». Яна лёгка можа прымусіць чырванець самых заўзятых фанатаў, бо цудоўна разбіраецца ва ўсіх нюансах гісторыі футбола.**

Паненка гадзінамі можа расказваць пра вядомых гульцоў, пра форму, міжнародныя спаборніцтвы... Найлепшым падарункам для яе будуць «ружы для фанатаў» — шалікі, паштоўкі, налепкі, нават карты — усё, што звязана з футболам. У яе калекцыі ёсць аўтографы зорак. Гэтыя і іншыя экспанаты можна ўбачыць на выстаўцы «Футбол — гульня мільёнаў» — у Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, дзе Настасся працуе дырэктарам. Ён знаходзіцца ў прыгарадзе Віцебска — у аграрным гарадку Акцябрская.

Карэспандэнту «Звязды» ў размове з Настассяй прыходзілася перыядычна казаць пра любоў да хакея, бо сорамна было прызнавацца, што пра многае не ведаў са свету футбола.

## УСЁ ПАЧАЛОСЯ З «ЕЎРА»

Падобнай выстаўкі ў Беларусі яшчэ не было. Яе экспазіцыя будзе даступная для агляду на працягу лета. Згодна з заявай ФІФА, у футбол на планеце гуляюць каля 250 мільёнаў чалавек. З іх больш за 20 мільёнаў — жанчыны! Для сапраўдных аматараў футбола выстаўка — «кландайк эмоцый».

У сям'і калекцыянера Настассі Пішчулавай ніхто не захапляецца футболам. Нават старэйшы брат.

— З дзяцінства любіла глядзець футбол. А пасля «Еўра-2012» зразумела, што маё сэрца належыць гэтай гульні. Першая любоў і на ўсё жыццё — «Рэал Мадрыд», — расказвае яна.

У 2013-м Настасся купіла білет на матч у сталіцы Іспаніі. Яе ўразіла ўсё: стадыён на 85 тысяч гледачоў, музей у чатыры паверхі, сама гульня.

— Білет у музей каштуе 19 еўра — дарагавата, але задавальненне вартае таго. Дазваляюць нават у службовыя памяшканні зайсці. У раздзявалку, напрыклад. Від з самага верху арэны незабыўны. А сярод сувеніраў нават соскі для немаўлядзі! Так, з сімволікай каманды! Я купіла дражэ, — расказвае фанатка.

Ад іншых заўзятараў футбола Насту адрознівае тое, што яна не ўжывае піва і, як правіла, глядзіць матчы дома. Сваякі вымушаны саступаць ёй месца насупраць экрана тэлевізара.

Яна з захапленнем расказвае, як у Мадрыдзе паважаюць футбол. Нават перакрываюць цэнтр горада, каб капітан каманды завязаў на шыі статуі багіні Кібелы, усталяванай у фантане на плошчы Сібелес, флаг Іспаніі з гербам мадрыдскага «Рэала». А прыхільнікі «Рэала» на кожнай 7-й хвіліне любога матча стоячы згадваюць гульца Хуаніта, які гуляў пад 7-м нумарам і загінуў у аўтакатастрофе... Футбол у Іспаніі як рэлігія.

## У ПОШУКАХ ЭКСПАНАТА

Настасся па адукацыі менеджар у галіне турызму. Скончыла ў Полацку каледж-філіял ВДУ імя П. М. Машэрава. Як большасць жанчын, добра разбіраецца ў модзе. Але любоў да футбола перыядычна бярэ верх. Падчас нашай размовы была ў футболцы, на спіне якой яе прозвішча.

— Зрабілі пад заказ для мяне *(усміхаецца)*. Конкурс выйграла на лепшае фота з сімволікай «Рэала». Выставілі маё фота на стадыёне, і наведвальнікі сайта прагаласавалі... А вы ведаеце, колькі ў гульцоў камплектаў формы? — пытае нас яна.

— Тры: для дамашніх матчаў, выязных і запасная.

Штогод камплекты мяняюцца. Такім чынам, больш старая па часе выпрабу — найбольш каштоўная для калекцыянераў. Самая старая футболка ў калекцыі Насці — 1998 года. Купіла ў Мадрыдзе. А тыраж адпаведнай сувенірнай прадукцыі невялікі — максімум пару тысяч. Захопленыя футболам шукаюць такія экспанаты ў інтэрнэце на аўкцыёнах, у крамах сэканд-хэнд. Адну з пакупак у віцебскай краме Настасся паказала нам. Каштуе некалькі рублёў. І не падробка, а ад вытворцы. Для параўнання, новы камплект, калі яго купляць у краме клуба, можа каштаваць больш за 150 еўра.

— Некаторыя вядомыя мадэльеры ахвотна ствараюць спартыўную форму. Японскі дызайнер адзення Ёджы Ямамота такім чынам «адзеў» «Рэал», — расказвае дзяўчына.

Самыя каштоўныя шалікі — «футбольныя ружы для фанатаў» — да пэўнага матча, калі на іх указаны дата і каманды, якія гуляюць. У калекцыі Пішчулавай і такія ёсць.

## У АКЦЯБРСКУЮ — ПА ЭМОЦЫІ

На выстаўцы можна ўбачыць футболкі, у аналагах якіх гулялі Пеле, Ранальдзіньё, Месі, Раналду і многія іншыя. Шмат білетаў з розных матчаў Лігі Еўропы і Лігі чэмпіёнаў. Сярод асабліва дарагіх сэрцу калекцыянера экспанатаў — аўтографы знакамітых гульцоў: з швейцарскага і нямецкага клубаў. Настасся Пішчулава напісала ім лісты і атрымала такія цудоўныя падарункі. Для тых, хто не разбіраецца ў футболе, экспазіцыя таксама будзе вельмі цікавай. Ад налепак, паштовак, часопісаў, газет, якія тут прадстаўлены, цяжка адарвацца. Ёсць, напрыклад, паштоўка 1948 года з фота каманды «Зеніт».

Ад экскурсавода можна даведацца шмат цікавых фактаў. Напрыклад, пра тое, што радзіма футбола — Англія. Там у XIX стагоддзі з'явіліся клубы і афіцыйна пачалі праводзіць турніры. Але малюнкі з выявай гульні за шмат вякоў да гэтага з'явіліся ў Егіпце, ёсць выявы і ў пірамідах майя. Невытлумачальна, але ў гэтую гульню гулялі народы розных кантынентаў, не ведаючы, што недзе за акіянам ёсць таксама футбалісты.





Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

А вось жыхарам сучаснай Грэнландыі не пашанцавала. Міжнародная футбольная асацыяцыя забараніла мець каманду, бо... мала травы на востраве!

Дырэктар музея расказа пра тое, што самы доўгі матч адбыўся 11 красавіка 2009 года ў Вялікабрытаніі. Ён доўжыўся 36 гадзін! На таварыскай сустрэчы ніяк не маглі вызначыць пераможцу. Потым падлічылі, што кожны футбаліст правёў на полі па 18 гадзін і прабег прыкладна па 70 кіламетраў. А самы вялікі лік мае прыкладна 150 галоў! Столькі забіла каманда Мадагаскара ў свае пустыя вароты ў знак пратэсту супраць несправядлівага судзейства...

Настасся расказала, што ў яе ёсць сябар — заўзятар іншага футбольнага клуба. Яны дамовіліся выключаць мабільныя тэлефоны, каб не нерваваць адно аднаго, калі гуляюць іх любімыя каманды. На развітанне пацікавіўся ў калекцыянера: напэўна, яе каханы — футбаліст, або такі ж захоплены футболам? Аказваецца, сур'ёзных стасункаў у дзяўчыны пакуль няма. Цікава, што атрымаецца, калі яе будучы выбраннік будзе хварэць не за «Рэал»...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ «Шаўковы шлях — 2017»

# Перамагчы сябе, сапернікаў і каварныя пяскі пустыні



**Айчынная каманда «МАЗ-СПОРТаўта» прымае ўдзел у ралі «Шаўковы шлях — 2017». Чакаецца, што гонка стане сур'ёзным выклікам для ўсіх удзельнікаў. Гоншчыкам неабходна будзе пераадолець 9608 км. Уся дыстанцыя падзяляецца на 14 этапаў. На кожным з іх ёсць спецучасткі — цяжкапраходныя трасы, якія патрабуюць максімуму майстэрства і намаганняў ад каманды. Агульная іх даўжыня складае 4089 км. Сёлета дыстанцыя будзе яшчэ больш складанай. Павялічыцца і нагрузка на экіпажы. Ім у літаральным сэнсе давядзецца змагацца з сабой, канкурэнтамі і трасай. Гаворачы пра апошнюю — удзельнікаў чакаюць бязмежныя стэпы, небяспечныя горныя серпанціны, каварныя пяскі. З многімі перашкодамі экіпажу прыйдзецца сутыкнуцца ўпершыню.**

Гэтым разам ралі «Шаўковы шлях» праходзіць у фармаце трансканцінентальнага марафону па тэрыторыі Расіі, Казахстана і Кітая. Стартавалі ўдзельнікі ўчора, 7 ліпеня, на Краснай плошчы ў Маскве. Самыя лепшыя каманды фінішуюць 22 ліпеня ў Кітаі ў горадзе Сіянь.

**Камерцыйны дырэктар МАЗа Аляксандр ЗАХАРЧАНКА** паведаміў, што тэхніка і экіпажы добра падрыхтаваныя. Наша каманда ў баявым настроі. «Гаворачы аб гонцы, хачу адзначыць, што яна нарошчвае свае абароты. Расце і ўвага да яе ва ўсім свеце. Сёлета яе асвятляюць для 195 краін. Гэта цікава яшчэ і таму, што перад нашым прадпрыемствам востра стаіць задача дыверсіфікацыі паставак. Дзякуючы ўдзелу ў гэтых гонках пазнавальнасць нашай тэхнікі ва ўсім свеце толькі ўзрасце», — расказаў Аляксандр Захаранка. Ён таксама паведаміў, што сёлета сітуацыя з продажамі прадукцыі кампаніі выглядае лепш, чым летась: «Гэтае паўгоддзе мяркуем скончыць на ўзроўні больш за 130% экспарту прадукцыі аўтазавода ў параўнанні з аналагічным перыядам летась. Тэмпы вытворчасці таксама растуць».

**Кіраўнік каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ**, ён жа і пілот экіпажа 304-й машыны, лічыць, што «Шаўковы шлях—2017» уяўляе сабой адну з найбольш складаных канфігурацый трасы. «Мы пачалі рыхтавацца да гэтай гонкі адразу пасля заканчэння ралі «Дакар». Усе этапы падрыхтоўкі да беларускага чэмпіянату былі таксама звязаны з падрыхтоўкай да «Шаўковага шляху». Экіпажы і аўтамабілі, якія будуць удзельнічаць на гэтай гонцы, практычна не змяніліся. Каманда ставіць перад сабой задачу дамагчыся як мінімум леташняга выніку. У 2016 годзе мы ўсімі экіпажамі трапілі ў топ-10. Сёлета разлічваем на лепшы вынік, нягледзячы на тое, што склад удзельнікаў гонкі гэтым разам нашмат больш сур'ёзны. Мы да гэтага гатовыя», — запэўніў Сяргей Вязовіч. На яго думку, «Шаўковы шлях — 2017» на парадак больш складаны за «Дакар—2017». «У сувязі з гэтым у нашых трэніроўках асаблівая ўвага ўдзялялася фізічнай падрыхтоўцы. Тэхніка рыхтуецца на высокім узроўні да кожнай гонкі незалежна ад таго, беларуская яна, ці гэта этап міжнароднага спаборніцтва», — дадаў кіраўнік каманды.

У ліку сапернікаў выступаюць такія каманды, як «КамАЗ», «IVECO», «Renault», «Tatra». Усе каманды выставілі не менш за тры машыны. Прыблізна гэтак жа выглядае і група лідараў на «Дакары». Канкурэнцыя будзе аналагічнай», — падкрэсліў Сяргей Вязовіч.

Ён мяркуе, што каманда «КамАЗ» — галоўны канкурэнт для беларусаў. Яна з'яўляецца наймацнейшай. Акрамя таго, яе шанцы на перамогу павялічваюцца, як у арганізатара гонкі. Прыплюсуем сюды і тое, што расіяне прадстаўлены найбольшай колькасцю аўтамабіляў — чатырма экіпажамі. «Аднак я не думаю, што для каманды «Камаз-майстар» гэта будзе лёгкі хатні шпацыр. Па выніку мінулай гонкі ўсе зразумелі сур'ёзнасць маршруту, усе ведаюць адзін аднаго. Канкурэнцыя будзе вельмі вострая, па-спартыўнаму злая, і за месца на п'едэстале прыйдзецца ўсім папрацаваць», — рэзюмаваў Сяргей Вязовіч.

Гонка — не толькі забава для заўзятараў і добры піяр на ўвесь свет для Беларусі ў цэлым і МАЗа ў прыватнасці, але і выпрабавальны палігон, дзе кампанія праверыць працаздольнасць сваіх ноу-хау. Экстрым-тэсту падвергнуцца таксама і ўсе камплектуючыя завода, на 85% з якіх складаецца кожны са спартыўных аўтамабіляў. Сюды можна аднесці раму, надбудову кузава, каркас бяспекі, панэлі, кранштэйны, сістэму ахаладжэння рухавіка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

## ■ Еўрагульні-2019

# Возьмем цеплынёй, атмасферай і гасціннасцю

**Беларусь плануе правесці Еўрапейскія гульні з аптымальным бюджэтам, пра гэта заявіў дырэктар Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў — 2019 Георгій КАТУЛІН. Ён адзначыў, што арганізатары ўлічаць вопыт Азербайджана, дзе праходзілі I Еўрагульні, але не плануюць занадта вялікіх выдаткаў. *«Мы возьмем цеплынёй, атмасферай, беларускай гасціннасцю і добрай арганізацыяй. Паколькі ў краіне развіта спартыўная інфраструктура, мы былі гатовыя правесці Гульні з прыцягненнем абласных гарадоў, але была прынятая іншая канцэпцыя (зніжэнне выдаткаў), і прыйшлося сканцэнтраваць спаборніцтвы ў Мінску»,* — адзначыў Георгій Катулін.**

Урачыстая цырымонія адкрыцця пройдзе на стадыёне «Дынама» 21 чэрвеня 2019 года. Правядзенне спаборніцтваў запланавана на 20—30 чэрвеня. Цырымонія закрыцця гульняў адбудзецца 30 чэрвеня. Алімпійскую вёску для пражывання спартсменаў арганізуюць у сталічнай Студэнцкай вёсцы. Зона гасціннасці Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў размесціцца ў гатэлі «Марыёт».

Сімволіка другіх Еўрапейскіх гульняў ужо зацверджана і будзе прадстаўлена грамадскасці пазней. *«Гэта будзе арыгінальнае рашэнне, заснаванае, перш за ўсё, на нацыянальных традыцыях. Гэтыя традыцыі чырвонай ніткай пройдуць праз сімволіку гульняў і знойдуць адлюстраванне ў цырымоніях адкрыцця і закрыцця Еўрагульняў»,* — растлумачыў Георгій Катулін.

На час правядзення топ-турніру беларускі бок бярэ на сябе абавязацельствы спрасціць мытныя працэдуры (у дачыненні да спартыўнага, медыцынскага і іншага абсталявання) для ўсіх удзельнікаў спаборніцтваў для паскоранага праходжання мытні. Таксама Беларусь збіраецца выкарыстоўваць практыку бязвізавага ўезду для гасцей мерапрыемства.

Дарэчы, Міністэрства спорту і турызму прапаноўвае павялічыць тэрмін бязвізавага знаходжання ў Беларусі да 10 сутак. Гэта датычыцца не толькі часу правядзення Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. Неабходнасць павелічэння бязвізавага тэрміну Мінспорту тлумачыць у тым ліку важнасцю развіцця санаторна-курортнага кірунку. *«Але на першым плане пры прыняцці канчатковага рашэння будуць пытанні бяспекі: вы бачыце, што ў свеце здараецца. Разам з тым работа па павелічэнні гэтага тэрміну вядзецца»,* — адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ.**

Нагадаем, пяцідзённы бязвізавы рэжым у Беларусі для грамадзян 80 краін пачаў дзейнічаць 12 лютага. Абавязковай умовай з'яўляецца прыбыццё праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## ■ Футбол. Ліга Еўропы

# «Дынама» ідзе далей,

### а «Шахцёр» завяршыў выступленне ў Лізе Еўропы

**У першым раўндзе кваліфікацыі футбалісты мінскага «Дынама» ў гасцях перамаглі «Рунавік» з Фарэрскіх астравоў з лікам 2:0 і выйшлі ў наступны раўнд турніру. Нягледзячы на тое, што ўжо на шостай хвіліне матча з поля быў выдалены Арцём Быкаў, на 32-й хвіліне мінчане адкрылі лік, гол у актыве Антона Сарокі. Канчатковыя лічбы на табло былі ўсталяваны ўжо ў дадатковы час гульні, арбітр прызначыў у вароты «Рунавіка» пенальці, які паспяхова рэалізаваў усё той жа Сарока.**

У другім раўндзе адбору Лігі Еўропы «Дынама» сустрэнецца з ФК «Работнічкі» з Македоніі.

*— Я задаволены. Пастаўленую мэту выканалі — прайшлі далей,* — адзначыў **галоўны трэнер мінчан Сяргей ГУРЭНКА.** *— Вядома, перамога далася няпроста, але, можа, гэта нават лепш. Хлопцы адчулі, што такое Ліга Еўропы, што тут няма дробязяў, што ўсё магчыма. Мы ўжо ведалі вынік салігорскага «Шахцёра» — нам нельга было вылятаць. Гэта стала б катастрофай для ўсяго беларускага футбола.*

*Наступны матч у нас у нядзелю, згуляюць тыя, хто меў мала практыкі. У першую чаргу трэба прааналізаваць гульню македонцаў у двух апошніх матчах. Трэба рыхтавацца, праходзіць іх і чакаць наступнай жараб'ёўкі.*

Футбалісты «Шахцёра» саступілі на выездзе літоўскай «Судуве» — 1:2 і не выйшлі ў другі раўнд кваліфікацыі Лігі Еўропы. Нагадаем, першы матч паміж гэтымі камандамі завяршыўся ў Салігорску нічыёй — 0:0.

Трэці прадстаўнік Беларусі ў Лізе Еўропы, уладальнік Кубка краіны брэсцкае «Дынама» пачне свой турнірны шлях з 2-га раўнда. Яго сапернік — аўстрыйскі «Альтах». Першы матч адбудзецца 13 ліпеня ў гасцях, матч у адказ — 20 ліпеня ў Брэсце.

Адзначым, што ў галоўным кантынентальным клубным турніры Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ пачне выступленне з 2-га раўнда кваліфікацыі. Першы паядынак супраць армянскага «Алашкерта» каманда правядзе 12 ліпеня на полі «Барысаў-Арэны».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб правядзенні адкрытага конкурсу на распрацоўку талісмана II Еўрапейскіх гульняў 2019 года

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Арганізатарамі адкрытага конкурсу на распрацоўку талісмана II Еўрапейскіх гульняў 2019 года (далей — конкурс), з'яўляюцца Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года», Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь (далей — Арганізатары).

1.2. Мэта правядзення конкурсу:

вызначэнне талісмана II Еўрапейскіх гульняў 2019 года (далей — талісман).

Задачы:

уцягванне шырокіх колаў насельніцтва Рэспублікі Беларусь ва ўдзел у конкурсе на вызначэнне талісмана II Еўрапейскіх гульняў 2019 года (далей — Еўрагульні-2019) і яго наймення;

прапаганда асноватворных прынцыпаў і каштоўнасцяў алімпійскага руху ў Рэспубліцы Беларусь;

прыцягненне ўвагі грамадскасці і сродкаў масавай інфармацыі да правядзення Еўрагульняў-2019;

папулярызацыя відаў спорту, уключаных у праграму Еўрагульняў-2019;

павышэнне аўтарытэту беларускага спорту на міжнароднай арэне;

развіццё іміджу Арганізатараў.

1.3. Пры правядзенні конкурсу Арганізатары кіруюцца наступнымі паняццямі:

«талісман» — графічны, мастацкі, стылізаваны вобраз, створаны пры дапамозе колеру, аб'ёму, сімвалаў, які адлюстроўвае мэту і задачы дадзенага конкурсу. Талісман Еўрагульняў-2019 павінен адпавядаць агульнай канцэпцыі Еўрагульняў-2019 — арганічнае спалучэнне алімпійскіх цырымоній з традыцыйным нацыянальным святам «Купалле», быць лёгкім і зразумелым балельшчыкамі і гледачам, а таксама выклікаць станоўчыя асацыяцыі, адпавядаць слогану «Bright Year, Bright you» («Время ярких побед», «Час яскравых перамог»).

«Пераможца конкурсу» — удзельнік, які адказвае патрабаванням конкурсу і падаў найлепшую конкурсную прапанову, на думку журы адкрытага конкурсу на распрацоўку талісмана Еўрагульняў-2019 (далей — Журы).

«Лаўрэат конкурсу» — удзельнік, які адказвае патрабаванням конкурсу і падаў конкурсную прапанову, якая заняла, на думку Журы, 2-е ці 3-е месца.

1.4. Конкурс з'яўляецца адкрытым па складзе ўдзельнікаў.

У конкурсе маюць права прымаць удзел фізічныя, юрыдычныя асобы і аўтарскія калектывы Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў.

1.5. Удзельнік нясе ўсе выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і прадстаўленнем яго конкурснай прапановы, а Арганізатары ў любым выпадку не з'яўляюцца адказнымі за гэтыя выдаткі незалежна ад выніку конкурснага працэсу.

2. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс лічыцца адкрытым з 7 ліпеня 2017 года пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Палажэння на сайце Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (www.mininform.gov.by) і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь (www.noc.by).

2.2. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

Першы этап — прыём, апрацоўка і адбор конкурсных работ.

Другі этап — фінальны. Вызначэнне пераможцы.

Тэрмін правядзення першага этапу: з 7.07.2017 па 15.11.2017.

Тэрмін правядзення другога этапу: з 16.11.2017 па 30.11.2017.

2.3. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна накіраваць Арганізатару конкурсу:

заяўку на ўдзел па форме згодна з дадаткам 1;

конкурсную работу, выкананую як індывідуальна, так і аўтарскімі калектывамі ў графічным выяве.

2.4. Выява талісмана павінна быць прадстаўлена ў электроннай форме ў выглядзе каляровага малюнка, выкананага ў любой тэхніцы (уключаючы камп'ютарную графіку).

2.5. Малюнак павінен быць завершаным. Фармат файла — .jpg, .psd, .cdr, .ai. Памер файла — не менш за 600 dpi, не больш за 2 Mb.

Асноўныя графічныя элементы талісмана павінны без страты распазнавальнасці прайгравацца ў любым памеры — як на памяншэнне, так і на павелічэнне, а таксама павінны без страты распазнавальнасці быць прыдатныя да ўзнаўлення на любых носьбітах (папера, кардон, пластык, шкло і г. д.).

Выява талісмана павінна суправаджацца кароткай тлумачальнай запіскай, якая раскрывае творчую ідэю аўтара, а таксама змяшчае прапановы ў дачыненні імя (наймення) талісмана.

2.6. Удзельнікі конкурсу накіроўваюць заяўку на ўдзел і файл з выявай талісмана на электронную пошту Арганізатара: info@mininform.gov.by (у тэме пісьма пазначыць «Конкурс»).

2.7. Сваёй заяўкай удзельнік пацвярджае аўтарства работы. У выпадку парушэння аўтарскіх і сумежных правоў у конкурснай рабоце, адказнасць за парушэнне нясе ўдзельнік конкурсу.

2.8. Удзельнік конкурсу, накіроўваючы работу на конкурс, пацвярджае сваю згоду на бязвыплатнае адчужэнне выключнага права на дадзеную работу на карысць Арганізатараў поўным аб'ёме і без выплаты аўтарскага ўзнагароды.

2.9. Колькасць заявак на ўдзел у конкурсе ад аднаго ўдзельніка не абмяжоўваецца.

2.10. Арганізатарамі не прымаюцца для ўдзелу ў конкурсе:

творчыя работы, якія паступілі па-за перыядам прыёму заявак;

заяўкі, якія не адпавядаюць умовам гэтага Палажэння.

2.11. Арганізатары не вяртаюць атрыманыя творчыя работы асобам, якія прадставілі іх для ўдзелу ў конкурсе.

3. ЖУРЫ

3.1. Склад журы конкурсу фармуецца і зацвярджаецца Арганізатарамі.

3.2. Журы вызначае прэтэндэнтаў на званне пераможца конкурсу і па адным лаўрэаце конкурсу — на 2-е і 3-е месцы.

3.3. Журы:

разглядае матэрыялы ўдзельнікаў конкурсу, якія паступілі на працягу першага этапу конкурсу;

выносіць рашэнне аб допуску да фінальнага этапу конкурсных работ прэтэндэнтаў конкурсу;

вызначае пераможцу і двух лаўрэатаў шляхам ацэнкі конкурснага прапанову, зыходзячы з інфармацыі, якая змяшчаецца ў пададзеных удзельнікам да разгляду матэрыялах.

4. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

4.1. Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца 15 снежня 2017 года ў будынку штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь па адрасе: г. Мінск, вул. Радужная, 27/02.

4.2. Пэўны па выніках конкурсу найлепшы талісман можа быць аб'яўлены афіцыйным талісманам Еўрагульняў-2019.

4.3. Арганізатары конкурсу пакідаюць за сабой права пры неабходнасці дапрацаваць талісман з улікам рэкамендацый членаў журы.

4.4. Правядзенне конкурсу асвятляецца ў сродках масавай інфармацыі, у сетцы Інтэрнэт і іншых інфармацыйных рэсурсах без дадатковай згоды ўдзельнікаў і без выплаты ім узнагароды.

5. УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

5.1. Пераможца конкурсу ўзнагароджваецца камплектам запрашальных білетаў на ўсе мерапрыемствы ў рамках Еўрагульняў-2019, уключаючы цырымоніі адкрыцця і закрыцця, а таксама камплектам парадна-спартыўнай экіпіроўкі нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь на Еўрагульнях-2019.

5.2. Лаўрэаты конкурсу ўзнагароджваюцца:

5.3. за 2-е месца — камплектам запрашальных білетаў на цырымоніі адкрыцця і закрыцця Еўрагульняў-2019, а таксама камплектам парадна-спартыўнай экіпіроўкі нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь на Еўрагульнях-2019.

5.4. за 3-е месца — камплектам парадна-спартыўнай экіпіроўкі нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь на Еўрагульнях-2019.

5.5. Па рашэнні Арганізатараў могуць быць заснаваны дадатковыя прызы для ўдзельнікаў Конкурсу, якія занялі месцы з 4-га па 10-е.

ЗАЯЎКА

на ўдзел у адкрытым конкурсе на распрацоўку талісмана II Еўрапейскіх гульняў 2019 года

| | |
|---|---|
| **Прозвішча, імя ўдзельніка** | |
| **Дата нараджэння** | |
| **Месца вучобы/працы** | |
| **Дамашні адрас** | |
| **Кантактны тэлефон** | |
| **Адрас электроннай пошты** | |
| **Кароткая тлумачальная запіска да праекта талісмана** | |

У выпадку, калі работа выканана аўтарскім калектывам, у заяўцы падаюцца звесткі аб кожным удзельніку творчага калектыву.

З умовамі конкурсу азнаёмлены(а) і згодны(а) ________________ (Подпіс)

# ДАРОГІ СЫШЛІСЯ Ў ЧЭРЫКАВЕ

## Гэты прыгожы раён багаты на традыцыі, маляўнічыя мясціны і сардэчных людзей

**Па адных звестках Чэрыкаў атрымаў назву ад таго, што тут у старажытныя часы было шмат чырыкаў — людак, якія імкліва рассякалі плынь ракі Сож — прытока Дняпра. Продкі тутэйшых жыхароў былі здабытчыкамі, умелі гандляваць. Па іншай версіі, назва горада пайшла ад слова «чарціць» на зямлі, або іншымі словамі «араць». Па сутнасці абодва варыянты можна лічыць правільнымі, бо жывуць тут людзі сумленныя, якія плённа працуюць на карысць роднага краю.**

### НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА



— Наша зямля часткова пацярпела ад Чарнобыля, але гэта не значыць, што яна страціла прывабнасць, — кажа **старшыня Чэрыкаўскага райвыканкама Міхаіл КАСМАЧОЎ.** — У нас ёсць і што паглядзець, і да чаго прыкласці свае працавітыя рукі. Відавочным плюсам Чэрыкава ва ўсе часы было тое, што ён знаходзіцца на скрыжаванні дарог. У старажытныя часы суднаходная рака звязвала Чэрыкаў з расійскімі і ўкраінскімі гарадамі. Вельмі добра тут былі развіты прамысловасць і рамесніцтва. Да рэвалюцыі колькасць насельніцтва, па некаторых звестках, складала каля 60 тысяч чалавек. Гэта быў дастаткова буйны і паспяховы гандлёвы цэнтр. Зараз на тэрыторыі раёна жыве 13,5 тысяч чалавек. Але гэта паранейшаму добрасумленныя руплівыя людзі — гонар і для раёна, і для ўсёй краіны.

Чэрыкаўшчына цікавая сваёй унікальнай прыродай і старадаўнімі традыцыямі, мае вялікі патэнцыял для вядзення паспяховага бізнесу. Новыя магчымасці перад інвестарамі адкрыла праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна, у якую мы ўвайшлі. Для дзелавых людзей яна прадугледжвае дадатковыя льготы і прэферэнцыі. У горадзе і раёне ёсць перспектыўныя пляцоўкі на любы густ. Нядаўна на нас звярнулі ўвагу літоўцы. У іх гатовы праект на 2 мільёны еўра па стварэнні на плошчы 1,5 гектара вытворчасці безалкагольных напояў. Яшчэ адзін праект па птушкагадоўлі збіраюцца рэалізаваць на Чэрыкаўшчыне масквічы. Але ў нас ёсць яшчэ шмат прапаноў, якія могуць зацікавіць бізнесменаў. Больш падрабязна пра гэтыя магчымасці можна пачытаць на сайце **cherikov.mogilev-region.by.** Звяртайцеся, мы гатовы да канструктыўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

### ЛЕПШЫЯ ПА ДОБРАЎПАРАДКАВАННІ

Новыя будынкі, прыгожыя кветнікі, незвычайныя па форме прыпыначныя павільёны — Чэрыкаў за апошнія гады прыкметна папрыгажэў.



— Будуем жыллё, аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння, сацыяльнай сферы. Летась увялі ў дзеянне новы Цэнтр культуры, які вырашыў шмат праблем і стаў сапраўдным упрыгожаннем горада, — расказвае **Дзмітрый РУБАН, намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама.** — Штогод у Чэрыкаве здаём па адным шматкватэрным доме, летась насаселле справілі жыхары 12-кватэрнага дома сацыяльнага прызначэння ў аграгарадку Верамейкі. Сёлета будуем у Чэрыкаве 20-кватэрны жылы дом, да гэтага ўзводзілі 40-кватэрны і 60-кватэрны. Для спецыялістаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў будуем аднакватэрныя домікі на сяле. Цяпер у людзей з'явілася магчымасць пабудаваць жыллё з прыцягненнем крэдыту пад 1% па Указе №235. Крэдыт выдзяляецца пры ўмове, што чалавек на працягу 10 гадоў не будзе мяняць месца свайго жыхарства. І дзевяць такіх чалавек ужо ёсць.

Развіваецца інфраструктура раёна, будуюцца і рамантуюцца дарогі. Сёння ў дарожным будаўніцтве акцэнт робіцца на бетон, і Чэрыкаў адзін з лідараў у выкарыстанні гэтага матэрыялу. За два апошнія гады пабудаваны тры бетонныя дарогі на вуліцах Першамайская, Кастрычніцкая, Ціміразева.

На жаль, у раёне пакуль няма ніводнага басейна. Для здачы нарматыву па плаванні школьнікаў возяць у суседнія раёны, што само па сабе стратна. Насельніцтва часта звяртаецца да раённых улад з просьбай пабудаваць ФАК. «Прыгожая пляцоўка для яго ёсць, але сіламі раёна такі аб'ект не падняць», — прызнаецца Дзмітрый Міхайлавіч.

***— Чэрыкаў неаднаразова станавіўся пераможцам рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў у сваёй намінацыі. Сёлета ён зноў заваяваў гэта званне. У чым сакрэт?***

— Кожны год робім малыя архітэктурныя формы, уладкоўваем дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі, на 100% заасфальтавалі ўсе дваравыя тэрыторыі. Пры падвядзенні вынікаў улічваецца таксама стан дарог, выкананне патрабаванняў па асобным зборы другасная сыравіны, іншыя параметры. І мы над гэтым шмат працуем.

### БУДУЧАЕ ЗА АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ ЭНЕРГЕТЫКАЙ



Чэрыкаўскі раён актыўна выступае за чысціню энергетыкі і робіць стаўку на альтэрнатыўныя крыніцы яе атрымання. Летась тут была ўведзена ў эксплуатацыю станцыя сумарнай магутнасцю 3 МВт, якая з дапамогай 11 400 сонечных панэляў пераўтварае сонечную энергію ў электрычную. Праект рэалізавала таварыства з абмежаванай адказнасцю «Энергія века», якое ў выніку змяніла магілёўскую прапіску на чэрыкаўскую.



Дзелавы (на фоне райвыканкама) і гандлёвы цэнтр Чэрыкава.

— Ёсць яшчэ адзін інвестдагавор з удзелам ірландскай кампаніі, які прадугледжвае будаўніцтва сонечнага парка магутнасцю 109 МВт, — дзеліцца добрай навіной **намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама Сяргей ПАЛУЙЧЫК.** — Гэты праект доўгатэрміновы, канчаткова яго плануецца рэалізаваць у ліпені 2019 года. Яшчэ адзін праект у сферы альтэрнатыўнай энергетыкі прапанавала прыватнае прадпрыемства «Энергія-Ра». Яно збіраецца пабудаваць на тэрыторыі Вепрынскага сельсавета сонечны парк, сумарнай магутнасцю 50 МВт. Не менш шматабяцальны праект па вытворчасці безалкагольных напояў. Менавіта такія мэты пераследуе літоўскі інвестар, якому даспадобы прыйшлася наша вада. Аналіз яе быў зроблены ў Літве, і па яго выніках прызнана, што яна вельмі высокай якасці з добрай мінералізацыяй.

Паспяхова развіваецца ў раёне дрэваапрацоўчая галіна. Летась у гэтай сферы было створана каля 4 камерцыйных арганізацыі. Але прывабных прапаноў, якія можна рэалізаваць на тутэйшых землях, яшчэ хапае. У дапамогу прадпрымальным людзям райвыканкам распрацаваў інвесткаталог, дзе прадстаўлена інфармацыя пра раён, перспектыўныя зямельныя ўчасткі, льготы і прэферэнцыі. «Нам трэба развіваць у першую чаргу прамысловы патэнцыял, бо з гэтым у нас пакуль праблемы, — адзначае Сяргей Іванавіч. — З 12 інвестпляцовак, якія мы прапаноўваем, 7 разлічаны на арганізацыю прамысловых вытворчасцяў. Але мы будзем не супраць, калі нехта вырашыць іх «перапрафіляваць». Мэтавае прызначэнне заўсёды можна памяняць.

*(Заканчэнне на 10-й стар.)*

### НА АДНЫМ «МЕРЫДЫЯНЕ» З ПАКУПНІКОМ

**У рыначных умовах важна не разгубіцца, бо выжывае толькі той, хто сумее хутка і правільна адаптавацца. Чэрыкаўскае раённае спажывецкае таварыства не сядзіць на месцы, развіваецца і не перастае радаваць пакупніка новымі сучаснымі крамамі і якаснымі вырабамі.**

**Летась папулярнае ў раёне гандлёвае прадпрыемства падаравала жыхарам зручны гандлёвы павільён «Візіт», дзе разам з прадуктамі можна набыць і спадарожныя тавары прамысловай групы.** А нядаўна запрасіла пакупнікоў у краму «Мерыдыян», дзе шмат дзіцячых і спартыўных тавараў. Не забыліся тут пра куток для дзіцячай творчасці і тэматычную фотазону для рамантычных здымкаў.

— А яшчэ мы пашырылі гандлёвыя плошчы магазінаў «Усё для дома», «Алеся», «Мэбля». Гэта дало магчымасць значна павялічыць асартымент прапанаваных тавараў нехарчовай групы, — адзначае **начальнік гандлёвага ўчастка Таццяна ДРАЗДОВА.** — Больш лёгкім зрабілі доступ да тавару ў крамах аграгарадкоў. Цяпер там прымяняецца метад самаабслугоўвання, што дазваляе пакупніку лепш выбіраць асартымент на палічках.

**У летні час раённае спажывецкае таварыства адкрывае ў горадзе пункты вынаснога гандлю квасам, а таксама два сезонныя кафэ, адно з якіх дзіцячае.** Гандлёвыя пункты прадпрыемства заўсё-



ды карыстаюцца папулярнасцю на восеньскіх кірмашах, а таксама на святах раёна, вобласці і краіны. Бо прадукцыя, якая тут прапаноўваецца, на смак нічым не адрозніваецца ад хатняй. У хлебапякарным цэху штодзённа нараджаецца свежы духмяны хлеб і смачная выпечка. Ёсць таксама каўбасны цэх, кандытарскі, цэх паўфабрыкатаў і па перапрацоўцы рыбы.

— Свежыя тарты, піражныя, булачкі і мноства іншай выпечкі здольны задаволіць нават пераборлівага пакупніка, — запэўнівае **першы намеснік старшыні праўлення Лідзія КАВЕРЫНА.** — Частка нашай прадукцыі рэалізуецца яшчэ і на тэрыторыі Крычаўскага і Касцюковіцкага раёнаў. Што датычыцца каўбас і мясных паўфабрыкатаў, то іх у нас выпускаецца 17 і 30 найменняў адпаведна. Плюс 5 найменняў салёнай рыбы. А яшчэ мы штодня забяспечваем спажыўца свежай агароднінай, квашанай капустай, мочанымі агуркамі, таматамі, яблыкамі, якія нарыхтоўваем самастойна.



**Насельніцтва раёна абслугоўвае 43 аб'екты гандлю, з якіх 23 — у сельскай мясцовасці.** У 52 населеных пунктах, дзе адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка, тавар падвозяць дзве аўтакрамы. Прадпрыемства мае яшчэ і 26 аб'ектаў грамадскага харчавання — сталовыя пры ўстановах адукацыі, кафетэрый пры гандлёвых аб'ектах, рэстаран, кавярню, дыскабар і бутэрбродную.

— Большасць страў, якія там прапаноўваюцца, — асабістай вытворчасці. І гэта тая прадукцыя, якой Чэрыкаўская райспажывкааперацыя можа забяспечыць хоць цэлую вобласць. Яна вартая таго, каб яе пакаштаваць, — кажа **начальнік аддзела грамадскага харчавання Рыма КАВЕРЫНА.**

**Чэрыкаўскае райспажывтаварыства гатова паставяць сваю прадукцыю ў гандлёвыя сеткі любога населенага пункта вобласці і будзе рада супрацоўніцтву з прадпрыемствамі розных формаў уласнасці.**

— Сёлета запланавана мадэрнізацыя жывёлабойнага пункта, што дазволіць нам пашырыць сыравінную базу, ахапіць усе паўднёва-ўсходнія рэгіёны Магілёўскай вобласці і павялічыць аб'ёмы перапрацоўкі мяса, — дзеліцца планамі **старшыня праўлення Чэрыкаўскага раённага спажывецкага таварыства Ігар ЦЕРАШКОЎ.**

**Спажывецкая кааперацыя Чэрыкаўскага раёна аб'ядноўвае 4220 пайшчыкаў, абслугоўвае 8,2 тысячы жыхароў гарадскога насельніцтва і 5,2 тысячы жыхароў сельскай мясцовасці.** У таварыстве працуюць 290 чалавек. І гэта ў асноўным сумленныя, адказныя людзі, вартыя шчырых слоў падзякі і ўзнагарод. Сярод вялікай колькасці тых, хто сёлета быў узнагароджаны — намеснік старшыні праўлення Мікалай Крыжэвіч, вядучы бухгалтар Ганна Маркава, інжынер-энергетык Сяргей Маеўскі, начальнік вытворчага ўчастка Валянціна Кабузоўская, агент па забеспячэнні гандлёвага ўчастка Віка Ісакава, спецыяліст па кадрах 2-й катэгорыі Алена Пастушэнка, прадавец 5-га разраду гастранома «Родны кут» Лідзія Рабцава, вытворца харчовых паўфабрыкатаў Тамара Новікава і многія іншыя.

УНП 700254702

# З клопатам пра сяло

**Крэда дырэктара чэрыкаўскага прадпрыемства «Бытпаслугі» Святланы КУЛІКОВАЙ: не здавацца ні пры якіх умовах і, як тая жаба з вядомай казкі, якая трапіла ў збан са смятанай, біць лапкамі, пакуль вадкая маса не ператворыцца ў масла. Інакш нельга — патонеш. Дыпломы і падзякі, якім цесна на сцяне, яскравае сведчанне таго, як тут працуюць. У куточку сціплага на выгляд дырэктарскага кабінета стаіць пераходзячы сцяг, які вельмі рэдка пакідае гэта месца. Назва прадпрыемства тройчы заносілася на абласную дошку гонару.**

**«Бытоўцы» Святлана Аляксееўна прысвяціла ўсё сваё жыццё. У Чэрыкаўскім прадпрыемстве, якое летась адзначыла паўстагоддзя свайго існавання, працуе амаль з моманту яго зараджэння. Прайшла ўсе прыступкі кар'ернай лесвіцы, на пасадзе дырэктара ўжо 18 гадоў. У яе шмат Ганаровых грамат, у тым ліку і міністэрская, яна была Чалавекам года Магілёўшчыны, а яе знак выдатніка бытавога абслугоўвання значыцца ў Беларусі пад нумарам 2.**



Дырэктар Святлана КУЛІКОВА з унучкай Ганначкай.

## Вёска галасуе рублём

Цяжкія эканамічныя ўмовы ў краіне, якімі так любяць апраўдвацца нядбайныя кіраўнікі, не перашкодзілі чэрыкаўскім «Бытпаслугам» захаваць усе восем комплексных прыёмных пунктаў на сяле.

— Калі пошта праводзіла аптымізацыю і закрывала свае аддзяленні сувязі, мы парапсілі два будынкі ў вёсках Зоры і Лобча, адзін з якіх ўзялі на баланс, другі ў арэнду, — расказвае Святлана Кулікова. — Калісьці там былі моцныя калгасы, цяпер іх няма. Але ж людзі засталіся, і мы ім патрэбны. У той жа Лобчы аказваецца паслуг на 1,5 тысячы рублёў у месяц, а ў Зорах — на 3 тысячы.



Майстар участка сяла Ніна ПАТАПЕНКА: «Гэтыя коўдры мы шыем сваімі рукамі».

Адзін з найлепшых комплексных прыёмных пунктаў, які некалькі гадоў таму быў прызнаны пераможцам рэспубліканскага конкурсу, знаходзіцца ў Верамейках, яго абслугоўвае ўсяго два чалавекі — прыёмшчык і цырульнік. З раніцы прыёмшчык едзе па вёсках прымаць заказы і развозіць ужо гатовыя. На ім — рэалізацыя швейных і трыкатажных вырабаў, прыём у рамонт адзення і абутку, халадзільнікаў і пральных машын, бялізны ў мыццё і шмат чаго іншага. Цырульнік таксама пры справе. У дзень да яго звяртаецца да 15 чалавек. Яшчэ адзін узорны прыёмны комплексны пункт знаходзіцца ў Сакалоўцы. Ён — пераможца спаборніцтва па выніках мінулага года. У яго самы высокі ўзровень аказаных паслуг. І гэта пры тым, што там працуе адзін чалавек, і то няпоўны дзень. Людзі ўдзячны ўжо толькі за то, што такі пункт ёсць і не трэба ездзіць па розных дробязях у Чэрыкаў.



Узорная праца.

## Знайсці падыход

Сёння абслугоўваць сяло ніхто асабліва не рвецца. Маўляў, нязручна, ды і грошай там няма. «Гэта няпраўда, — аспрэчвае Святлана Кулікова. — У людзей ёсць грошы, але няма паслуг, за якія яны гатовы заплаціць. Прапануюем 16 відаў паслуг, з якіх 11 аказваем у рамках выканання дзяржаўных сацыяльных стандартаў. І ўсе — запатрабаваныя.

Удзел у кірмашах, распрацоўка новых швейных і трыкатажных мадэляў — усе метады добрыя ў барацьбе за кліента. Толькі летась тут прапанавалі 85 новых найменняў адзення. На ўсю швейную і трыкатажную прадукцыю атрыманы сертыфікаты і дэкларацыі на адпаведнасць тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза.

Чэрыкаўская «бытоўка» карыстаецца папулярнасцю нават у Гомельскай вобласці, куды яна даязджае падчас кірмашоў. А што датычыцца жыхароў суседніх раёнаў Магілёўскай вобласці, дзе такія прадпрыемствы, на жаль, не захаваліся, то хапае прыкладаў, калі людзі перадаюць сваё адзенне на рамонт чэрыкаўскім майстрам.

— Робім усё для таго, каб чалавек пакідаў нас з усмешкай і добрым настроем, — кажа дырэктар. — Цяпер вось прапануем тавары ў крэдыт на два месяцы, практыкуем бартар. У гаспадаркі няма грошай, але ёсць мяса. Бяром разлік мясам і перапрадаём. Па сваіх аб'ёмах паслуг, па сродках, якія мы збіраем, мы знаходзімся на другім месцы пасля Асіповіч. А там насельніцтва ў некалькі разоў болей.

**Візітоўка**

*У склад чэрыкаўскага прадпрыемства «Бытпаслугі» ўваходзяць пральня, цэх дрэваапрацоўкі, цырульня, майстэрня па рамонце абутку, цэх індывідуальнага пашыву і рамонту адзення, фотаатэлье, станцыя тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, майстэрня па рамонце складаней бытавой тэхнікі і восем комплексных прыёмных пунктаў на сяле. З дапамогай дыспетчарскай службы прадпрыемства каардынуе аказанне паслуг як у сваім раёне, так і, пры неабходнасці, у іншых.*

## Каманды як сям'я

— У нас няма выпадковых людзей. Калектыў стабільны, дружны, адказнасць вялікая, — гаварыць калегамі Святлана Кулікова. — Шмат хто працуе па 40 гадоў і болей, тая ж Ніна Якаўлеўна Патапенка, якая загадвае ўсімі сельскімі прыёмнымі пунктамі, пераможца шматлікіх спаборніцтваў майстар атэлье індпашыву і рамонту адзення Святлана Баброва, загадчыца пральні Валянціна Бояр. Прыйшлі пасля вучылішча і засталіся Алена Духоўская, Галіна Баранава, Валянціна Сіўцова і іншыя. Мы тут як адна сям'я. Мне трэба ведаць пра кожнага ўсё: і што ў яго на душы, і як здароўе. Нельга, каб людзі адчувалі сябе непатрэбнымі. Гэта абавязкова будзе адбівацца і на працы. Нашы калегі з іншых раёнаў здзіўляюцца, наколькі цёплая ў нас атмасфера. Нічога дзіўнага няма. У нас проста даверныя адносіны з вялікай ступенню адказнасці за даручаны ўчастак працы.

***P.S.***

Падчас падрыхтоўкі матэрыялу выйшаў Указ Прэзідэнта №227 «Аб забеспячэнні якасці і даступнасці бытавога абслугоўвання», які прадугледжвае магчымасць выдзялення ў 2017 годзе дзяржаўнай падтрымкі з мясцовых бюджэтаў субсідый (кампенсацыі затрат) юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам на мэты, звязаныя з аказаннем бытавых паслуг у сельскай мясцовасці ў рамках дзяржаўных праграм. Святлана Кулікова спадзяецца, што атрымае гэтую дапамогу, бо ў яе службы канкурэнтаў няма не толькі ў Чэрыкаўскім раёне, але і ў некаторых іншых.

УНП 700025623

# НАЙЛЕПШЫ СЯРОД МАЛЫХ ГАРАДОЎ

## По выніках рэспубліканскага спаборніцтва Чэрыкаў сёлета заняў першае месца ў сваёй намінацыі па добраўпарадкаванні і азеляненні



Пад парасонам чакаць грамадскі транспарт больш прыемна.

**Калі заязджаеш у гэты раённы цэнтр, адразу ж звяртаеш увагу не столькі на чысціню яго вуліц, бо гэта вельмі характэрна для многіх населеных пунктаў Беларусі, а на незвычайнасць малых архітэктурных формаў і кампазіцый, якія яго ўпрыгожваюць. Ну дзе яшчэ вы знойдзеце прыпыначны пункт, якому дах замяняе прыгожы рознакаляровы парасон? Аўтар гэтага незвычайнага аб'екта, як і многіх іншых, прадпрыемства «Чэрыкаўскі жылкамунгас».**

### ВЫХАВАННЕ ЧЫСЦІНЁЙ

**Галоўны інжынер прадпрыемства Дзмітрый АНТОНАЎ** запрашае паглядзець найбольш знакавыя аб'екты.

— Вось тут мы робім прыгожага паўліна, хвост якому заменіць вялікі па форме кветнік, — расказвае ён па дарозе, калі мы праязджаем паблізу ад незвычайнай клумбы. — Наша перамога ў конкурсе толькі натхніла на новыя ідэі. Прыпыначныя павільёны ў рамантычным стылі пад даўніну, дэкаратыўныя лаўкі з металічнай коўкай. Дробязі, а месца цалкам мяняе свой выгляд. Зрабілі грот у месцы адпачынку нашых жыхароў. Ёсць вострай заказаных з лаўкай прымірэння і кампазіцыяй у выглядзе сэрца. Ужо стала традыцыяй, што маладажоны вешаюць замкі на гэта сімвалічнае сэрца, а ключы выкідваюць у возера.

Казачныя фігуры, керамікі, альтанкі — камунальнікі падыходзяць да афармлення горада творча і з душой. Для ўвасаблення дызайнерскіх выхадак вырошчваюць кветкі ў сваёй жа цяпліцы. Сёлета, дарэчы, у горадзе з'явілася шмат новых кветкавых кампазіцый, у тым ліку падвесных. Насельніцтва пад уплывам гэтай прыгажосці таксама стараецца не адставаць.

— Жыхары нам вельмі дапамагаюць падтрымліваць парадак, — кажа Дзмітрый Антонаў. — Чыстыя прыдамавыя тэрыторыі, своечасовы абкос травы — гэта часткова і іх заслуга. Прывучаем народ да асобнага збору смецця. Пішам адпаведныя заклікі на квітанцыях на аплаце камунальных паслуг, звяртаемся праз сродкі масавай інфармацыі. На платнай аснове прымаем ад насельніцтва макулатуру, шкло, пэт-бутэлькі, іншыя карысныя рэсурсы. Жыхары прыносяць другасную сыравіну і ў кошт аплаты камунальных паслуг.

### У ДОМ ПРЫЙШЛА ГАРАЧАЯ ВАДА

Водазабеспячэнне горада і раёна — адзін з галоўных кірункаў дзейнасці прадпрыемства. На балансе «Жылкамунгаса» 51 свідравіна, 16 веж і 12 кацельных.

— У 2014 годзе за кошт сродкаў Сусветнага банка цэнтральная кацельная Чэрыкава трапіла ў праект па рэабілітацыі драўнянай біямасы для сістэм цэнтралізаванага цеплазабеспячэння, — расказвае Дзмітрый Васілевіч. — Праект прадугледжваў устаноўку двух катлоў на шчэпках з мэтай замяшчэння імпартнага віду паліва — прыроднага газу. За кошт рэалізацыі гэтага праекта спажыванне газу паменшылася на 30—40%. Па праекце было заменена 6,4 кіламетра цеплацеak і ў 14 шматкватэрных дамоў прыйшла гарачая вада. Раней там стаялі электрападагравальнікі і газавыя калонкі.

Начальнік кацельнай Мікалай Уладзіміравіч Зарычка ўжо прывык да таго, што на кацельную водзяць экскурсіі, таму без лішніх слоў перахозіць да справы.

— Кацельная добрая тым, што працуе на мясцовых відах паліва. На газе гарачую ваду было б неэканомна даваць, — кажа ён і запрашае бліжэй пазнаёміцца з абсталяваннем. Яно, дарэчы, гомельскае.

— У раёне гэта першая станцыя, якая працуе на шчэпках, — кажа ён. — Персаналу для яе абслугоўвання патрабуецца мінімум. Цяпер упраўленне кацельнай вядзецца праз спецыяльную шафу. Усё да апошняга аўтаматызавана. Задаюцца параметры, і працэс пайшоў. Калі нешта не так, спрацоўвае светлавая і гукавая сігналізацыі.

Чэрыкаўскія камунальнікі, між тым, ужо плануюць яшчэ пра адну кацельную на шчэпках.

— У стадыі рэалізацыі мадэрнізацыя сістэмы цеплазабеспячэння аграгарадка Верамейкі з будаўніцтвам новай кацельнай і замена 4,6 кіламетра цеплацеак на пі-трубу, — дзеліцца добрай навіной Дзмітрый Антонаў. — У выніку яе запуску 28 дамоў будуць забяспечаны гарачай вадой. Праектам прадугледжана ўстаноўка аднаго газавага катла і двух — на шчэпках. Пакуль там стаяць выключна газавыя катлы. Фінансаванне будзе ажыццяўляцца таксама за кошт сродкаў Сусветнага банка.



Мікалай ЗАРЫЧКА *(злева)* і Дзмітрый АНТОНАЎ дэманструюць аўтаматычнае абсталяванне кацельнай.

### ВОКНЫ АСАБІСТАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Тры гады таму Чэрыкаўскі жылкамунгас адкрыў цэх па вытворчасці пластыкавых вокнаў, дзякуючы чаму было створана чатыры новых працоўных месцы. У асноўным прадукцыя, якая тут выпускаецца, актыўна выкарыстоўваецца пры будаўніцтве новых дамоў. Але вокны ахвотны можа набыць тавар у індывідуальным парадку.

Нязменнай папулярнасцю ў насельніцтва карыстаюцца паслугі па падключэнні да цэнтральнага халоднага водазабеспячэння. Распрацоўкай такіх праектаў займаецца праектны аддзел прадпрыемства.

— Працуем па прынцыпе аднаго акна, — тлумачыць Дзмітрый Васілевіч. — Чалавек толькі піша заяву, а ўсё астатняе робім мы. Бюро распрацоўвае праект, узгадняе з усімі службамі, прадпрыемства закупляе ўсе матэрыялы, прывозіць іх да заказчыка і робіць падключэнне да цэнтральнага водазабеспячэння. Акрамя гэтага, мы ўстанаўліваем прыбор, пламбіруем яго і бяром аплату з растэрмінойкай плацяжу да шасці месяцаў. Насельніцтву паслуга вельмі падабаецца. У месяц паступае да 30 заявак.

У будучыні «Жылкамунгас» марыць адкрыць яшчэ і сваю праліўную станцыю па паверцы прыбораў уліку вады.

— Пакуль мы возім іх у Магілёў, а гэта затратна і займае шмат часу, — аргументуе галоўны інжынер. — Калі б такая станцыя была ў нас, мы б маглі абслугоўваць не толькі Чэрыкаў, а яшчэ Краснаполле, Клімавічы, Хоцімск і наогул увесь паўднёва-ўсходні рэгіён. Пакуль яны таксама ездзяць паверaць прыборы ў Магілёў. Мы ж да іх значна бліжэй.

Наогул, перспектыўных планаў далейшага развіцця ў Чэрыкаўскага жылкамунгаса шмат. Адзін з іх — арганізаваць вытворчасць дробнаштучнай пліткі. Гэта б дапамагло патанніць дарожныя работы і павялічыць іх аб'ём.

УНП 700025692

# ЗЯЛЁНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

## Унікальныя геаграфічныя культуры, лясныя школы і сосны князёў Абаленскіх...

**Усё гэта і шмат чаго іншага не менш цікавага знаходзіцца на землях Чэрыкаўскага лясгаса. Яго лясніцтвы раскінуліся на тэрыторыі Чэрыкаўскага і Слаўгарадскага раёнаў. Часткова гэта забруджаная ў выніку чарнобыльскай аварыі зона, дзе ніякія работы не вядуцца. Але жыццё на чыстых плошчах, як той казаў, вірue.**

### ЛЕС ПАД НАГЛЯДАМ

— За пяць месяцаў лясгасам нарыхтавана 75 тысяч кубаметраў драўніны, рэалізацыя склала 67 тысяч кубаметраў, — адразу ж уводзіць у курс справы **дырэктар лясгаса Сяргей НЯМКЕВІЧ.** — Дробнатаварную драўніну перапрацоўваем і адпраўляем на ўнутраны і знешні рынкі. Супрацоўнічаем з прыбалтыйскай і нямецкай фірмамі. Адпраўляем частку балансавай драўніны ў Польшчу і Украіну. Выручка ад рэалізацыі склала 3 мільёны 638 тысяч рублёў. У параўнанні з мінулым годам яе рост за пяць месяцаў склаў 107%.

Лес — жывы арганізм і таксама з часам старэе. Калі не адсочваць гэты працэс, ён пачне засмечвацца ламаччам і не змогуць развівацца маладыя дрэвы. Таму першая задача работніка лясной гаспадаркі — прадбачыць гэта і папярэдзіць. Там, дзе лесу больш за тры гады, робяцца так званыя высечкі дагляду. За пяць месяцаў сёлета такіх высечак зроблена на плошчы 254 гектары. А новыя дрэўцы з'явіліся на плошчы 327 гектараў.

— Пасля леташняга ўрагану мы аднаўлялі лес не толькі на сваёй тэрыторыі, але і дапамаглі Чэрвеньскаму лясгасу, — расказвае Сяргей Нямкевіч. — Па выніках гэтай работы машыніст тралёвачнай машыны Андрэй Кушлянкоў быў узнагароджаны медалём «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый», шэсць работнікаў атрымалі граматы Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь і сем супрацоўнікаў — ганаровыя граматы і падзякі Магілёўскага дзяржаўнага вытворчага аб'яднання.



Кіраўнік прадпрыемства Сяргей НЯМКЕВІЧ.

### НАШЫ ДАСЯГНЕННІ

На палічках у кабінеце дырэктара кубкаў безліч. Супрацоўнікі прымаюць удзел у міжнародных, абласных і раённых спаборніцтвах і займаюць прызавыя месцы. Нядаўна на прадпрыемстве віншавалі Руслана Данадаева, які на абласных спаборніцтвах вальшчыкаў лесу стаў першым сярод кіроўцаў лесавозаў. А крыху раней на рэспубліканскім спартыўным мерапрыемстве лесавод Канстанцін Сцяпулькін заняў 2-е месца сярод гіравікоў. Спартыўныя спаборніцтвы дапамагаюць заўсёды быць у добрай фізічнай форме і дабівацца высокіх вынікаў у рабоце.



Чэрыкаўскі лясгас ганарыцца сваімі дасягненнямі.

Залаты фонд прадпрыемства — яго ветэраны. Яны па-ранейшаму ў страі і прымаюць актыўны ўдзел у жыцці роднага прадпрыемства. Мікалай Варонін 45 гадоў адпрацаваў у лясной гаспадарцы, заслужаны лесавод Рэспублікі Беларусь і ганаровы жыхар Чэрыкава. Яго сіламі ў Верамейкаўскім лясніцтве на плошчы трох гектараў створаны дэндрапарк. Зараз перадае свой вопыт маладому пакаленню. Яшчэ адзін былы ляснік Мікалай Сідараў, які адпрацаваў у лясгасе каля 40 гадоў, стварае на тэрыторыі прадпрыемства драўляныя ўпрыгажэнні. Яго альтанкі і церамкі можна ўбачыць каля адміністрацыйнага будынка і ў зонах адпачынку.

### АДПАЧЫЦЬ, А ЗААДНО МЯДКУ ПАКАШТАВАЦЬ

Паляўнічыя ўгоддзі ў Чэрыкаўскім лясгасе складаюць больш за 85 тысяч гектараў і дзеляцца на сем егерскіх абходаў. Пешшу такія ўладанні не абысці, але на ўзбраенні егераў ёсць аўтамабіль, матацыкл і нават снегаход. На тэрыторыі гадавальніка знаходзіцца ўтульны паляўнічы комплекс з апартаментамі для адпачынку, банкетнай залай, сталовай, лазняй. Усё з натуральнага дрэва, пах такі, што галава кружыцца. Мерапрыемства можна праводзіць як у памяшканні, так і на адкрытым паветры. Побач з комплексам зроблена некалькі сімпатычных альтанак. Пры жаданні можна здзейсніць цікавае падарожжа па экалагічнай сцяжыне. Там сустрэнецца шмат маляўнічых куточкаў. Сярод тых, хто любіць адпачываць на лясной базе, шмат расіян. Прыязджаюць паляваць на лася і казулю, а сёлета яшчэ і на аленя. Колькасць яго павялічылася настолькі, што дазваляе весці адстрэл. Адным словам, база не пустуе. За пяць месяцаў лясгас зарабіў на ёй 7,7 тысячы рублёў.



Гэта прыгажосць зроблена рукамі былога лесніка Мікалая СІДАРАВА.

А яшчэ лясгас прапануе насельніцтву смачны лясны мёд. Пасека, дарэчы, знаходзіцца непадалёк ад паляўнічага комплексу. За ёй наглядае ляснік Язёрскага лясніцтва Мікалай Цалабанаў, які неаднойчы ўзнагароджваўся за добрыя паказчыкі ў рабоце. Пчоламі займаецца, кажа, з дзяцінства, а лясгасаўскімі «кіруе» з 2005 года, калі пасека пераехала на гадавальнік. Тады, дарэчы, было ўсяго некалькі пчаліных сем'яў, а зараз іх — 56. Прызнаецца, што пчолы, бывае, джаляць яго, але гэта ідзе толькі на карысць. «Ніводнага бальнічнага за ўсё жыццё не браў», — усміхаецца ён.

### ЛЯСНЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ

На 24 гектарах гадавальніка Чэрыкаўскага лясгаса акрамя лесаўтваральных парод вырошчваюцца яшчэ і дэкаратыўныя дрэвы. Імі потым упрыгожваюцца вуліцы Чэрыкава і прыватныя прысядзібныя ўчасткі. Нядаўна непадалёк ад цяпліц адкрылася спецыяльная крама, дзе можна набыць саджанцы на любы густ. Дэкаратыўных раслін тут амаль 40 відаў.

Летам на дапамогу асноўным работнікам гадавальніка прыходзяць школьнікі.

У раёне на базе чатырох навучальных устаноў існуюць школьныя лясніцтвы. Вучні 7—10 класаў дапамагаюць збіраць шышкі на насенне, аказваюць дапамогу ў пасадцы лесу, робяць шпакоўні. І гэтыя веды прыносяць свой плён. Не так даўно вучаніца восьмага класа Язёрскай сярэдняй школы Дар'я Маргунова ў абласным конкурсе «Квітней, мой лес» заняла прызавое месца.



Будатрад на прапалцы.

Па ініцыятыве райвыканкама ў чэрыкаўскіх школьнікаў летам ёсць магчымасць зарабіць грошы ў лясным экалагічным будатрадзе. За 10 дзён працы найбольш старанныя маюць магчымасць атрымаць да 200 рублёў.

**Начальнік гадавальніка Дзмітрый АКТЫСЕЎ** прызнаецца, што дапамога ад падлеткаў відавочная. І ў тым, што апошнія пяць гадоў яго ўчастак у маштабах краіны стабільна пацвярджае званне гадавальніка высокай культуры, ёсць заслуга і тутэйшых памочнікаў.

На прапалцы школьнага аддзялення елкі на момант нашай размовы працавалі вучні 8—11 класаў чэрыкаўскіх школ.

— Некаторыя школьнікі потым выбіраюць сабе прафесіі, звязаныя з лесам, і вяртаюцца сюды на працу, — адзначае Дзмітрый. — Наша работа асаблівая, трэба ёй хварэць. Я і сам з «лясной» дынастыі.



Загадчык гадавальніка Дзмітрый АКТЫСЕЎ.

### ГЕАГРАФІЧНЫЯ КУЛЬТУРЫ І СОСНЫ АБАЛЕНСКІХ

Яшчэ крыху карыснай інфармацыі для турыстаў. На тэрыторыі лясгаса знаходзяцца некалькі дзясяткаў аб'ектаў археалогіі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Гэта стаянкі першабытных людзей, селішчы, курганы. Сярод тых, якія знаходзяцца на разглядзе ў райвыканкаме для надання ім статусу помнікаў прыроды мясцовага значэння, геаграфічныя культуры, пасаджаныя ў 1978 годзе, і сасновы бор каля вёскі Горкі. Абодва аб'екты ўнікальныя.

У Язёрскім лясніцтве сабраны геаграфічныя культуры еўрапейскай елкі з 28 рэгіёнаў былога Савецкага Саюза. Побач з дрэвамі з усіх абласцей Беларусі растуць расійскія, прыбалтыйскія экзэмпляры і іншыя. Каб нічога не пераблытаць, тэрыторыя падзелена на квадраты. Вучоныя з інстытута лесу НАН Беларусі адсочваюць, якія змяненні адбываюцца ў развіцці гэтых дрэў. Цікава, што елкі з іншых рэгіёнаў выглядаюць лепей, чым чэрыкаўскі экзэмпляр. Геаграфічныя культуры елкі ўнікальныя па сваім паходжанні, такіх у Беларусі вельмі мала.

Не менш унікальны аб'ект — сасновы бор каля вёскі Горкі. Некалькі гадоў таму падняўся шум вакол таго, што векавыя сосны, якія па прывязцы да былога маёнтка князёў Абаленскіх, носяць іх імя, пачалі высякаць. Сяргей Нямкевіч добра памятае, колькі тады прыйшлося выслухаць лясгасу абвінавачванняў у свой адрас. Але прадпрыемства зусім не ставіла мэты знішчыць насаджэнні.

— Гэта была санітарная высечка, — кажа ён. — Высякаліся менавіта тыя дрэвы, якія засохлі і ўяўлялі небяспеку для астатняга лесу. Драўніна аж рассыпалася, калі яе пускалі ў апрацоўку на пілараме. Для будаўніцтва яна не прыдатная, лес сваё ўжо перастаяў. На месцы высечаных дрэў мы пасадзілі новыя саджанцы.

Месца цікавае тым, што тут дагэтуль знаходзіцца пахаванне князёў. На раённым суботніку лясную тэрыторыю добраўпарадкавалі, прыбралі кустоўе, сучча. Вёска Горкі, дзе раней стаяў маёнтак, арганічна ўпісваецца ў лясны масіў, не адразу нават разумееш, дзе яны зліваюцца. Лясная сцежка прыводзіць якраз да старадаўняга пахавання, дзе на мармуровым пастаменце ляжыць камень дарэвалюцыйных часоў.

УНП 700025677



Помнік сярод лесу.

# ДАРОГІ СЫШЛІСЯ Ў ЧЭРЫКАВЕ

## НАСТРОЙ І ЗДАРОЎЕ ПАДОРЫЦЬ «БРАЗГУН»

Адной з візітак Чэрыкаўскага раёна з'яўляецца абрадавае свята пад назвай «Бразгун». Ёсць прыгожая легенда, як у старадаўнія часы паміж вёскамі Наркі і Вудага ў дзень святых Пятра і Паўла забіла моцная крыніца, перазвон пырскаў якой пачулі нават за некалькі кіламетраў у Нарках. Вада супакойлася толькі пасля таго, як на месцы крыніцы быў пастаўлены зруб з драўляным крыжам і прынесена ікона святых Пятра і Паўла. Цудадзейная ікона і зараз захоўваецца ў адной з жыхарак вёскі Наркі. У дзень святых Пятра і Паўла яе па традыцыі нясуць да крыніцы і месяцовы свяшчэннік праводзяць набажэнства. На свята з'язджаюцца людзі з розных куточкаў Беларусі і замежжа. Па старадаўнім абрадзе, чалавек, які пройдзе пад іконай, трапляе пад заступніцтва святых, яму адпускаюцца грахі і даецца шанц на лепшую долю.



— У 2011 годзе абрадавае свята «Бразгун» атрымала статут нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі, — расказвае **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чэрыкаўскага райвыканкама Кацярына КАРКОЗАВА.** — З 2014 года стала традыцыяй праводзіць у рамках гэтага абраду свята-конкурс фальклорных ансамбляў і сольных выканаўцаў. У мерапрыемстве прымаюць удзел творчыя калектывы з розных раёнаў. Чэрыкаўскі гісторыка-краязнаўчы музей арганізуе выстаўку этнаграфічных экспанатаў са сваіх фондаў, а раённы дом рамёстваў прапануе ацаніць зробленыя рукамі майстроў творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ёсць магчымасць пагартаць старонкі духоўнай літаратуры, якую падбірае для гэтага мерапрыемства раённая бібліятэка. Свята знаёміць людзей з культурнымі традыцыямі рэгіёна і служыць умацаванню міжрэгіянальнага творчага супрацоўніцтва. Далучыцца да нашых вытокаў можна будзе 13 ліпеня. Прыязджайце, будзем рады вас бачыць у нас у гасцях.

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



Кацярына КАРКОЗАВА раіць наведаць унікальнае абрадавае свята «Бразгун».

## Пад сцягам «Белай Русі»

ЧЭРЫКАЎСКАЯ арганізацыя грамадскага аб'яднання «Белая Русь» лічыцца адной з найлепшых у Магілёўскай вобласці і краіне ў цэлым. Тры гады таму ёй быў уручаны сцяг пераможцы агляду-конкурсу сярод раённых арганізацый Магілёўскай абласной арганізацыі «Белая Русь», які захоўваецца тут дагэтуль. Неаднаразова адзначалася за сваю ўзорную работу і **старшыня чэрыкаўскай арганізацыі Марыя ШВІНГЕЛЬСКАЯ.** На яе рахунку шмат ганаровых грамат рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў. Яна ж сціпла лічыць, што проста сумленна выконвае тую справу, якую ёй даручылі. А работа не такая ўжо і маленькая.



Пад кіраўніцтвам Марыі ШВІНГЕЛЬСКАЙ чэрыкаўская арганізацыя грамадскага аб'яднання «Белая Русь» тры гады запар станавілася пераможцам раённых спаборніцтваў у галіне грамадскіх фарміраванняў сярод арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў.

— За 10 гадоў дзейнасці раённай арганізацыі добрай традыцыяй для яе стаў удзел у мерапрыемствах «Белая Русь» — працаўнікам вёскі», «Лепшы па прафесіі», «Белая Русь» з любоўю да дзяцей» і шматлікіх іншых, — дзеліцца Марыя Васілеўна. — Няма ніводнай значнай палітычнай або грамадскай падзеі, у якой мы б не прымалі ўдзелу. Актыўна ўдзельнічаем у перадвыбарных кампаніях, праводзім пікеты, сустракаемся з працоўнымі калектывамі. Падтрымліваем адораную моладзь, уручаем ім падзякі і каштоўныя падарункі. У рамках акцыі «Белая Русь» — упрыгожвае Беларусь» удзельнічаем у суботніках. Сумесна з ветэранскай і прафсаюзнай арганізацыямі, а таксама маладымі патрыётамі з раённага камітэта БРСМ саджалі дрэвы на памятнай алеі ў гонар адселеных вёсак Чэрыкаўскага раёна, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праводзім акцыю «Чысты горад», у рамках якой вызначаем лепшыя пярвічкі па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Пераможцаў узнагароджваем падзячнымі лістамі і каштоўнымі падарункамі. Арганізуем штогод агляд-конкурс на лепшую пярвічку, якую таксама ўзнагароджваем. Мы нязменныя ўдзельнікі рэспубліканскай акцыі да Дня Незалежнасці, падчас свята наведваем радзільны дом і разам з раённай уладай віншуем парадзіх, якія сталі маці ў такі знамянальны дзень. Акрамя гэтага на Дзень Незалежнасці наведваем ветэранаў і робім ім падарункі. Наогул, мы цесна супрацоўнічаем з ветэранскай арганізацыяй, нядаўна разам адзначалі 30-годдзе яе існавання. Шмат чаго робім і для ўшанавання памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны. На грошы арганізацыі ўстаноўлены помнік невядомым воінам на грамадзянскіх могілках ў вёсцы Бакаў Чэрыкаўскага раёна, дзе сёлета былі перапахаваны знойдзеныя пошукавікамі астанкі байцоў.

У Чэрыкаве існуе вельмі прыгожая традыцыя адзначаць нараджэнне кожнага сотага дзіцяці, і прадстаўнікі арганізацыі разам са старшынёй райвыканкама ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюць падарункавы сертыфікат бацькам немаўляці і каштоўныя падарункі. Сёлета ў міжнародны дзень абароны дзяцей члены арганізацыі падтрымалі акцыю райвыканкама і разам з намеснікам старшыні Анжэлай Новікавай і прадстаўнікамі раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва наведалі 11 шматдзетных сем'яў, падарылі ім абутак і адзенне. Спіс добрых спраў можна працягваць да бясконцасці. Бо ён кожны месяц толькі папаўняецца.

— Кіраўнік краіны неаднаразова адзначаў, што стварэнне ў Беларусі трывалай і канкурэнтаздольнай эканомікі фарміруе дзяржаўную бяспеку і забяспечвае развіццё сацыяльнай сферы. Намі рэалізуюцца сацыяльныя праекты, якія спрыяюць фарміраванню грамадзянскай свядомасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі, патрыятычнаму выхаванню моладзі. Наяўнасць людзей, неабыякавых да лёсу сваёй краіны, да лёсу свайго роднага краю, усяляе ўпэўненасць у далейшым умацаванні аўтарытэту нашай арганізацыі, — падкрэслівае Марыя Швінгельская.

УНП 700844984

# Нас чытаюць нават у Мінску

## Чым заахвочвае чытачоў раённая газета «Веснік Чэрыкаўшчыны»

**Галоўны рэдактар газеты Алеся ГЛУХАВА — яскравы прыклад таго, як захопленыя сваёй справай маладыя спецыялісты замацоўваюцца ў невялікіх населеных пунктах. Прызнаецца, што быў момант, калі яна падумала, што адпрацуе два гады пасля вучобы ва ўніверсітэце і з'едзе. Але непрыкметна зрадніласа з райцэнтрам і зараз нават не ўяўляе сябе на іншым месцы. Праблем, вядомая справа, хапае, але ёсць такая добрая падтрымка, што сіл хопіць горы звярнуць.**

— Сама я з Гомельшчыны, але ў Чэрыкаў ехала свядома, — расказвае малады кіраўнік. — Былі ўсе магчымасці застацца ў Мінску, але хацелася кудысьці ў маленькі гарадок. На той момант я ўжо была замужам і мы разам з мужам (ён, дарэчы, таксама з Гомельшчыны) вырашылі, што тут будзе працаваць ў будаўніцтва жылля. Не тое, каб расчаравалася, але, прызнаюся, былі думкі збегчы. Праўда, калі ў мяне паявіліся аднадумцы накшталт Надзеі Казанковай, ад тых першых эмоцый і следу не засталося. Яна па адукацыі педагог, але колькі ў яе шыкоўных ідэй! Ды і наогул, усе нашы работнікі — людзі таленавітыя і адданыя сваёй прафесіі. З такімі працаваць адно задавальненне.

Менавіта пад кіраўніцтвам Алесі Глухавай газета пабалела ў аб'ёме, набыла колер і выйшла на акупнасць. У 2014 годзе дабавілася некалькі старонак, а з 2015-га суботні нумар стаў выходзіць на 12 палосах і часткова ў колеры. Не так даўно быў створаны аддзел рэкламы.

У газеце ёсць што пачытаць і дзецям, і ветэранам, і бізнесменам, і хатнім гаспадыням. Дзякуючы пастаянным праектам выданне стала своеасаблівым раённым летапісцам. Адзін з нумароў быў прысвечаны дзецям вайны. «Шмат людзей, якія апынуліся над акупацыяй, перажылі яе жахі, але не былі прыроўненыя ні да ўдзельнікаў вайны, ні да партызан, ні да іншых катэгорый, — кажа суразмоўніца. — Мы вырашылі хоць такім чынам аддаць ім даніну павагі. Гэты праект мы рабілі з райсаветам ветэранаў».

Яшчэ адзін праект «Гісторыя ў фотаздымках» набыў вялікую папулярнасць. Калі тры гады таму ў рэдакцыі рыхтаваліся да 95-гадовага юбілею газеты і разбіралі фота, знайшлі шмат цікавых кадраў. Напрыклад, захаваўся здымак цяперашняга начальніка раённага вузла сувязі, дзе ён сядзіць вярхом на слупе ў якасці электраманцёра. Ён з задавальненнем пагадзіўся расказаць пра тое, як дарос да начальніка. Атрымаўся выдатны матэрыял.

Галоўнага рэдактара крыху непакоіць толькі тое, што рыхтаваць газету прыходзіцца ў спартанскіх умовах. Рэдакцыя знаходзіцца ў будынку, якому даўно патрабуецца капрамонт. З таго часу як газета выйшла на самаакупнасць і ў яе паявіліся грошы, пачалося паэтапнае абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Купілі новыя камп'ютары, фотаапараты, зараз у планах памяняць вокны і ўваходную групу. Але не ўсё можна зрабіць сваімі сіламі. Тут даўно марацца і пра добры аўтамабіль. Раён не маленькі, а паспець хочацца ўсюды.

Газета, між тым, запатрабаваная. Яе сённяшні тыраж складае 2800 асобнікаў.

— Калі падлічыць, атрымліваецца адна газета — на 4—5 жыхароў раёна, — ганарыцца Алеся Глухава. — Нас выпісваюць у Светлагорску, Мінску, Віцебску і на Магілёўшчыне. Ёсць чытач з Касцюковіцкага раёна, які піша нам вершы на літаратурную старонку. У нас з жыхарамі добрая зваротная сувязь. Яны нам паведамляюць аб праблемах, а мы высвятляем, як іх рашыць. Нашы старонкі ёсць і ў сацыяльных сетках, дзе ў нас таксама сябры. Прыемна, што нашу работу ацэньваюць і на прафесійным узроўні. Летась мы занялі другое месца ў штогадовых абласных спаборніцтвах сярод рэдакцый дзяржаўных абласных, гарадскіх і раённых газет. А ў абласным конкурсе сацыяльных тэхналогій у абароны сямейных каштоўнасцяў «За жыццё» мы выйшлі на першае. Гэта натхняе на новыя вынікі.





Галоўны рэдактар Алеся ГЛУХАВА.

УНП 700025610

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Вольга ГЕЦЭВІЧ, Святлана СУШКО, Нэлі ЗІГУЛЯ zigulya@zviazda.by. Фота Нэлі ЗІГУЛІ і з архіваў прадпрыемстваў.

■ Цёмнае мінулае

# КІМ БЫЎ ЗВЕР З ЖЭВАДАНА

**Кажуць, калі Артур Конан Дойл даведаўся гісторыю пра Жэваданскага звера, ён неадкладна сеў за стол і напісаў сваю «Сабаку Баскервіляў». Праўда, каб не паглыбляцца ў містыцызм, зрабіў дрэсіраваным монстрам звычайнага італьянскага мастыфа. Тады як гісторыя пачвары з французскага Жэвадана зусім не такая адназначная і дагэтуль незразумелая.**
**Навукоўцы зрабілі мноства здагадак аб тым, што за жывёла гэта была, дайшоўшы ў палеміцы ўжо зусім да незвычайнага — дагістарычнага эндрусарха, чые сваякі вымерлі дзясяткі мільёнаў гадоў таму. Містыкі ж сцвярджаюць, што Жэваданскі звер быў не кім іншым як самым сапраўдным пярэваратнем. І тыя і іншыя могуць мець рацыю, таму што і таму і другому ёсць мноства спадарожных фактаў. З упэўненасцю сцвярджаць можна толькі адно — галівудскія кіношнікі ў сваім «Брацтве ваўка», натуральна, пайшлі супраць ісціны...**


Гравюра Жэваданскі звер. 1764 г.

Уся гісторыя Жэваданскага звера, калі разглядаць яе з пункту гледжання навукі і логікі, — адно вялікае непаразуменне. Ён выйшаў на «сцежку вайны» летам 1764 года і наводзіў жах на насельніцтва з усёй жэваданскай акругі цэлыя тры гады. Звер, што нетыпова, паляваў выключна на людзей і ва ўпор ігнараваў жывёл. Але нават калі прыняць пад увагу, што жывёла, якая аднойчы пакаштавала чалавечыну, будзе пры наяўнасці выбару харчавацца менавіта ёй, зусім не факт, што яна стане грэбаваць іншым мясам. Жэваданская ж пачвара паводзіла сябе супраць усіх законаў прыроды.

Першай яго ахвярай стала чатырнаццацігадовая пастушка Жанна Буле. Здавалася б — з'еш авечку і знікні, але не. За адно лета таго года Звер загрыз пяцярых


Аб'ява пра ўзнагароду за галаву Жэваданскага звера. 1765 г.

дзяцей. Ну, дзеці — зразумела, з імі, пры ўдалым збегу абставін, справіцца і дзікі сабака. Але далей — болей. Звер пачаў нападаць спачатку на бабулек, а потым і зусім на жанчын у росквіце гадоў. Прычым рабіў гэта не як звычайны драпежнік, які ўчэпліваецца ікламі ў ногі, рукі, ці хоць бы шыю. Не! У яго была вельмі дзіўная тактыка — імкліва кінуўшыся на чалавека, ён валіў яго на спіну, пасля чаго адкусваў твар. Так, у літаральным сэнсе гэтага слова. Выядаў шчокі, піў кроў з горла і толькі затым разрываў страўнік, раскідваючы вакол нецікавыя вантробы.

У тое лета выратавацца ўдалося толькі адной сялянцы — трыццацігадовую жанчыну абаранілі яе ўласныя быкі. Наставіўшы на монстра рогі, яны прагналі Звера. Думаеце, яго гэта спыніла? Зусім не! У верасні Звер аб'явіўся проста пасярод вёскі Эстрэ і зноў напаў на сялянку. На яе немыя крыкі з дамоў павыскоквалі людзі з сякерамі і віламі, але ўсё, што ім удалося ўбачыць, — як нейкая жывёла няспешна даядае сваю ахвяру ў садзе пад яблыняй. Зірнуўшы на сялян, яна неахвотна адарвалася ад вячэры і накіравалася (не ўцякла!) у бок лесу. Вось тады яго ўпершыню і апісалі відавочцы.

Паводле іх слоў, пачвара была падобная на ваўка, але памерам з цяля. Бурай афарбоўкі з цёмнай паласой на спіне, доўгай пысай з зубамі-брытвамі, шырокімі грудзьмі палевага колеру, хвастом, якія заканчваўся кутасікам, накшталт ільвінага. Таксама відавочцы адзначалі, што рухі Звера былі павольныя, можна сказаць, нават элегантныя, яны больш нагадвалі рухі буйных кошак, а не ваўкоў.

А ў лістападзе ён паспрабаваў нападаць ужо на дарослых моцных мужчын. Жан-П'ер Пуршэ, абыходзячы ноччу свае загоны з жывёлай, сутыкнуўся са Зверам, так сказаць, твар да твару. І нават стрэліў у таго з мушкета, які ўдала трапіўся пад руку. А вы думалі нармальныя людзі ў вёсках выходзяць сярод ночы на двор без бярданкі? Зверу стрэлы не пашкодзілі (хоць трапілі ў цэль), але спынілі, што дало селяніну час паспяхова рэціравацца. На наступны дзень жывёлавод расказваў жандарскаму прыставу (яго расказ запратакаліраваны і захаваўся), што «сустрэўшыся позіркамі з пачварай, я быў уражаны вачыма звера: яны ў яго былі чалавечыя!»

Гэта пераканала грамадскасць у тым, што яны маюць справу не з ваўком, з пярэваратнем. Мясцовы святар у наступнай жа пропаведзі ахрысціў звера «Бізуном Божым», пасланым на няшчасныя сялянскія галовы за грахі караля і дваранства. Каб спыніць падрыў аўтарытэту Людовіка XV і ўлады ў цэлым, мясцовы дзяржорган Лангедока адправіў на злоў звера 56 драгунаў пад кіраваннем Жака Дзюамеля. Тыя перастралялі ў навакольных лясах сотню ваўкоў. Але звера так і не змаглі злавіць. Праўда, сутыкнуліся з ім тварам да твару, калі ён дадаў нявеядомага сялянскага хлопчыка. Стрэлілі ў яго некалькі разоў і нават нібыта трапілі. Прынамсі, па расказах відавочцаў, звер спачатку ўпаў, а затым падняўся і кульгаючы адышоў у бок лесу.

З аднаго боку, на пару тыдняў забойствы спыніліся, але варта было грамадскасці расслабіцца, як монстр аднавіў сваю дзейнасць з новай сілай. Цяпер ён нападаў кожны дзень, а тое і па два-тры разы на суткі, не асабліва звяртаючы ўвагу на тое — ноч на дварэ або дзень. Акурат пасля Каляд, 27 снежня, пачвара напала на чацвярых, дваіх з якіх забіла і з'ела. Што ні кажы, на паводзіны звычайнай, нават вельмі галоднай, жывёлы гэта ні разу не падобна.

У пачатку студзеня 1765 года вайну Зверу абвясціла ўжо хрысціянская царква. Ну, як абвясціла. У сілу сваіх сакральных магчымасцяў — біскуп горада Менд правёў малебен аб бяспецы жыхароў Жэвадана і наваколля. Пасля чаго Звер, ужо як бы атрымаўшы канчатковы статус Пярэваратня, неадкладна забіў яшчэ з дзясятак чалавек. Жэвадан ператварыўся ў філіял апісанай Брэмам Стокерам Трансільваніі. Людзі выходзілі з хаты групамі не меншымі за тры чалавекі, на ноч замыкалі дзверы і аканіцы на цяжкія завалы, а днём ладзілі рэгулярныя аблавы на ваўкоў, у адной з якіх удзельнічала тысяча сялян.

Усё гэта было бессэнсоўна. Монстр быў няўлоўны і незабівальны. Стралялі ў яго так рэгулярна, што любы іншы даўно ператварыўся бы ў рэшата. Яго, здавалася, не брала нічога, а нахабства і агрэсіўнасць ужо перайшлі ўсе разумныя межы. Аднойчы ён паспрабаваў з'есці дваццацігадовую Мары-Жан Вале проста на мосце цераз рэчку на вачах ва ўсёй вёскі. Дзяўчына маху не дала і ўваткнула ў звера вілы. Ён моўчкі паваліўся ў ваду... каб з'явіцца зноў ужо на наступны дзень.

Чуткі пра жэваданскія непрыемнасці дайшлі да Парыжа, і цяпер сам Людовік XV распарадзіўся прыняць рашучыя меры, паабяцаўшы 6000 ліўраў (гіганцкую суму, роўную прыблізна 100 000 цяперашніх еўра) за труп звера. У верасні тысячы паляўнічых усіх рангаў і саслоўяў прыбылі ў Тэнайзерскі лес, каб пачаць самае вялікае паляванне ў гісторыі чалавецтва. Узначаліў яго галоўны каралеўскі лоўчы — Франсуа Антуан дэ Батэрн, чалавек пажылога веку, але з цвёрдай рукой і вострым вокам. Прачэсваючы лес уздоўж і ўпоперак, загоншчыкі сапраўды наткнуліся на ваўка вялікіх памераў з рудымі падпалінамі на шкуры і пагналі яго на лоўчага. Той нядоўга думаючы ўсадзіў ваўку кулю проста ў правае вока. На звера гэта не зрабіла асаблівага ўражання, але дало час салдатам зрабіць прыцэльны залп па жывёле. Тая зваліла ся каля самых ног Батэрна. Ваўка агледзелі, выпатрашылі, знайшлі ў яго страўніку некалькі палосак чырвонай тканіны, прызналі «Жэваданскім зверам», напакавалі з яго пудзіла і радасна павезлі ў Парыж, дзе Батэрн атрымаў сваю ўзнагароду. Амаль тры месяцы аб монстры нічога не было чуваць, і ў Версалі планавалі вялікае свята з нагоды пазбаўлення ад крыважэрнай істоты. Але раптам з Лангедока зноў прыйшлі благія весткі.

Знакаміты паляўнічы і следапыт Дэневаль, адпраўлены каралём яшчэ ў першае вялікае паляванне на поўдзень сваіх уладанняў, выявіў, што дзе-нідзе побач са следам звера з'яўляюцца і чалавечыя сляды. Стваралася поўная ілюзія таго, што ў монстра ёсць гаспадар, які кіруе яго дзеяннямі. Падазронне ўпала на ляснічага Антуана Шастэля.

Асоба Антуана — сама па сабе вельмі незвычайная для такой лясістай глушы, як Жэвадан. Ён умеў чытаць і пісаць, у юнацтве паспеў пабываць мараком, быў узяты ў палон алжырскімі піратамі і шмат гадоў правёў у пустыні сярод туземцаў-берберыаў. Неймаверным чынам вярнуўшыся дадому, ён пасяліўся ў хатцы на гары Мушэ і завёў сабак, да дрэсіроўкі якіх, як кажуць, меў асаблівы талент. Ён не тое каб цураўся людзей, але стараўся лішні раз з імі не перасякацца.


Ілюстрацыя, якая паказвае Жэваданскага звера. 1760-я гг.

Хоць, трэба прызнаць, Антуан разам з бацькам Жанам і братам П'ерам прымалі


Стэла з выявай Жана Шастэля ў Бесер-Сент-Мары, Лазер.

ўдзел у вялікай аблаве. Там пры ўдзеле малодшых Шастэляў адбылася страшэнная сварка, што вымусіла Батэрна, як арганізатара мерапрыемства, адправіць усіх траіх у акругову турму, каб астудзіць гарачыя галовы. Дзіўна, але якраз на гэты час забойствы спыніліся, што дало надзею на тое, што Батэрн падстрэліў «правільнага» звера. Аднак варта было сямейству вярнуцца ў сваю родную вёску, як следам за імі вярнуўся і Жэваданскі звер. Дэневаль быў не ідыёт, ён умеў супастаўляць факты...

Між тым мясцовы арыстакрат маркіз д'Апшэ не пакідаў думкі расправіцца з монстрам, які забіў яго сына і пажыраў яго падданых, і, улічваючы правальную каралеўскую аперацыю, арганізаваў уласнае паляванне. Не такое маштабнае, але значна больш паспяховае. 19 чэрвеня 1767 года трыста паляўнічых, сярод якіх быў і Жан Шастэль, бацька нашага ляснічага, выйшлі на аблаву. І менавіта Жану ўдалося падстрэліць Звера. Жан ці то ведаў штосьці, ці то проста быў вельмі рэлігійным чалавекам, схільным да містыцызму, але на паляванне ён узяў з сабой Біблію, а стрэльбу зарадзіў сярэбранымі кулямі. Так-так, тымі, якія толькі і могуць забіць вервольфа. Варта было яму, уладкаваўшыся на лужку, адкрыць Свяшчэннае Пісанне і пачаць яго чытаць, як з лесу выйшаў Звер. Ён не нападаў, а проста глядзеў. За што і атрымаў дзве сярэбраныя кулі, якія забілі яго напавал. Праўда, дзіўна? Хоць многія лічаць, што гісторыкі крыху раздулі рэлігійнасць Жана, а сярэбраныя кулі зусім прыдумалі.

Воўк, забіты Шастэлем, быў меншы, чым можна было меркаваць, але ў яго страўніку знайшлі частку чалавечай лапаткі, што канчаткова пераканала ўсіх, што Жэваданскі звер нарэшце мёртвы. Удзячныя мясцовыя жыхары сабралі Шастэлю ўзнагароду ў 72 ліўры. А з трупа ваўка таксама зрабілі пудзіла і адправілі ў Парыж. Але сяляне былі не вялікімі спецыялістамі ў таксідэрміі, так што пудзіла пачало па дарозе гніць, ствараючы невыносны смурод. Яно нават не паспела даехаць да Версаля. Кароль загадаў свайму асабістаму ўрачу Бюфону агледзець пудзіла і неадкладна пахаваць яго. Дом далёкіх сваякоў д'Апшэ, Ла Рашфуко, у двары якога закапалі астанкі Звера, зраўнялі з зямлёй у 1825 годзе, і ён унёс з сабой тайну монстра.

Для гісторыі гэта была вялікая памылка, таму што навукоўцы да гэтага часу так і не зразумелі, кім на самай справе была пачвара з Жэвадана — ваўком-вар'ятам, гібрыдам сабакі і ваўка, гіенай, прывезенай з далёкіх падарожжаў Антуанам Шастэлем, ці ўвогуле дагістарычным монстрам, які цудам вылупіўся пасярод Севены.

Колькасць забойстваў (па некаторых крыніцах, ад 83 да 170 і больш за 200 пакаленчаных) прымушала думаць, што воўк быў не адзін, а іх існавала цэлая зграя. Адны адзначалі, што воўк быў адзін, але паводзіў сябе для бязмозгай жывёлы занадта разумна — ніколі не трапляў у пасткі і ваўчыныя ямы, ігнараваў атручаныя прынады і на працягу трох гадоў паспяхова сыходзіў ад уладжаных на яго аблаў. Гэта значыць вылучаўся выключным для ваўка інтэлектам. Ды да таго ж быў лёгка забіты сярэбранай куляй. А ўлічваючы, што да гэтага ў яго не раз стралялі і ён валодаў выключнай жывучасцю, гэта наводзіла на нядобрыя думкі аб тым, што справу людзі мелі не з жывёлай, а з чалавекам, або loup-garou — пярэваратнем.

Але самае дзіўнае — іншае. Ляснічага Антуана Шастэля з тых часоў ніхто больш не бачыў...

Гісторыя Жэваданскага звера пакінула адначасова яскравы і змрочны след у гісторыі Францыі, дзе яму ставяць нават помнікі. Не абмінуў Звер і масавую культуру: яго нярэдка згадваюць у літаратурных творах, на аснове забойстваў у Жэвадане быў зняты фільм «Брацтва ваўка», а затым і «Брацтва ваўка-2: Вяртанне пярэваратня», але другі фільм не мае ніякага дачынення да першага, проста рускамоўныя выдаўцы вырашылі схітраваць.

*5respublika.com*

■ На адкрытай прасторы

Сёння распачынаюцца летнія суботнія канцэрты класічнай музыкі ў цэнтры Мінска

# ЭЛІТНАЯ МУЗЫКА Ў ФАРМАЦЕ OPEN AIR

**Для праекта «Класіка ля Ратушы з velcom» гэта лета становіцца ўжо трэцім сезонам. Вечаровыя суботнія канцэрты сталі неаспрэчным, стыльным і нарэшце карысным упрыгожаннем горада — якраз тым, што хочацца зрабіць традыцыяй. Папулярызацыя акадэмічнай музыкі для нашай прасторы не з'яўляецца чымсьці новым — яшчэ ў савецкія часы кіраўніцтва рабіла на яе стаўку як на высокае мастацтва, з якім можна сабе атаясамліваць. Фартэпіянныя канцэрты па радыё, балеты на тэлебачанні, выязныя выступленні філармоній сёння замяніліся фарматам open air мерапрыемстваў у гістарычнай частцы сталіцы, каля Ратушы на плошчы Свабоды, якія разносяць па горадзе гукі славутых кампазітараў. Да канца лета ў Мінску адбудзецца восем адмысловых канцэртаў з цэлымі аркестрамі, прафесійнымі выканаўцамі і замежнымі гасцямі. І на першы вечар, прысвечаны 90-годдзю Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі, плошча Свабоды запрашае ўжо сёння. «Класіку ля Ратушы» пры генеральнай падтрымцы кампаніі velcom сёлета ствараюць Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і канцэртнае агенцтва «Эквілібрыум Артс», а мы пагутарылі з дырэктарам апошняга Захарам ДУДЗІНСКІМ.**



***— Праект «Класіка ля Ратушы» выкарыстоўвае класічную музыку ў форме мастацтва для мас, інакш кажучы, спалучае ў сабе элітнае мастацтва з масавым. Тое, што гэта сусветная тэндэнцыя прыйшла ў Беларусь, — добры знак, а ў чым яе рэальная каштоўнасць для нашай прасторы?***

— Адказ знаходзіцца ў самім пытанні: дзякуючы праекту класічная музыка кожны год атрымлівае новы імпульс і пашырае кола сваіх слухачоў. Упэўнены, «Класіка ля Ратушы» можа быць флагманам класічнай музыкі ў Беларусі. Нават вулічныя музыкі, для якіх ствараюцца адмысловыя кропкі для выступленняў, калі ўбачаць, як аўдыторыя ўспрымае класіку, пачнуць выконваць не толькі каверы папулярных песень, але ўсё больш класічных кампазітараў, імправізацыі на іх вядомыя творы. А пра станоўчае ўздзеянне акадэмічнай музыкі на арганізм чалавека мы ўжо не раз чыталі ў розных СМІ. Так, вядома, фэсты класікі не дацягваюць да маштабаў рок-фестываляў ці фестываляў электроннай музыкі, але гэта не значыць, што яна не запатрабавана ў слухача! Проста мы не чуем яе з кожнага «праса», таму такое ўражанне і ўзнікае. Аднак прыгожая класічная музыка здольна спыніць нават самага занятага чалавека, натхніць яго на добрыя ўчынкі, захапіць.

**«У існуючым канкурэнтным полі ідзе сапраўдная бітва за наведвальніка, і галоўная зброя — гэта прадукт. Мы ў сваёй зброі ўпэўненыя».**

***— Якія інструменты ў планаванні канцэртаў вы выкарыстоўваеце для таго, каб зрабіць «Класіку ля Ратушы» як мага больш папулярным у наведвальнікаў праектам?***

— Каб зрабіць «Класіку ля Ратушы з velcom», патрэбна вялікая падрыхтоўчая праца. У Беларусі ёсць народныя і заслужаныя калектывы, таленавітыя салісты, а яшчэ ёсць шэраг выканаўцаў у краінах блізкага і далёкага замежжа — іх усіх хочацца паказаць у Мінску. У сувязі з гэтым велізарная работа праводзіцца на стадыі адбору: неабходна ведаць, што выконваюць калектывы і на якім узроўні, разумець іх магчымасці і пры гэтым улічваць перавагі гледачоў. Не так часта класічная музыка выходзіць за межы філармоній, канцэртных залаў і ўзаемадзейнічае з такой колькасцю слухачоў. Таму неабходна зацікавіць наведвальнікаў вечара, каб яны прыйшлі зноў. Сама праграма носіць папулярызатарска-адукацыйны характар — гэта спалучэнне агульнавядомых класічных твораў з кампазіцыямі, якія рэдка выконваюцца ў нашай краіне, але маюць такі ж статус здабытку сусветнай культуры. Мы паспрабуем за восем вечароў паказаць разнастайнасць класічнай музыкі, хоць гэта вельмі складаная задача.

***— А ці складана арганізаваць прастору для канцэртаў? Маецца на ўвазе сам выбар пляцоўкі каля Ратушы, зручнасць для музыкантаў і гасцей, размяшчэнне іншых аб'ектаў накшталт дзіцячай пляцоўкі ці «свабодных раяляў».***

— Пляцоўка на плошчы Свабоды ўжо стала традыцыйнай, гораду падабаецца ідэя канцэртаў у гістарычнай частцы Мінска. Практычна ўсе нашы вечары — гэта канцэрты аркестраў, калектывы з вялікай колькасцю музыкаў. Ім усім неабходна прастора, каб пераапрануцца, пакінуць свае рэчы. Ад гэтага і шэрагу іншых дробязяў, напрыклад, наяўнасці вады, залежыць настрой артыстаў і агульная атмасфера вечара. Але сумесна з гарадскімі ўладамі і нашымі партнёрамі гэтыя пытанні паступова вырашаюцца. Камунікацыя пры стварэнні такога вялікага праекта іграе важную ролю.

***— У якіх суадносінах на працягу ўсяго цыкла канцэртаў знаходзяцца беларуская і сусветная музыка?***

— Вечар 12 жніўня будзе поўнасцю прысвечаны беларускай музыцы. Канцэрт нават носіць назву «Беларуская рапсодыя». Ансамбль «Мінск-класік» выканае праграму «Музыка забытага кіно». У аснову канцэрта ўвайшлі кампазіцыі з кінастужак, знятых на «Беларусьфільме» ў 1960—1970-х гадах. На гэтых фільмах вырасла не адно пакаленне людзей. Яны розныя, знятыя рознымі рэжысёрамі ў розныя гады, але аб'ядноўвае іх тое, што музыку да іх стварыў выдатны беларускі кампазітар, народны артыст БССР і СССР Яўген Глебаў. Яго кінамузыка — сапраўдны здабытак нацыянальнай беларускай культуры, настолькі самадастатковы і разнастайны, што кампазіцыі можна выконваць асобна ад фільма, захоўваючы іх маляўнічасць і зразумеласць для слухача. Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь музычная капэла «SONORUS» з дырыжорам Марынай Трацяковай падорыць наведвальнікам прыгожую праграму «Беларускі сувенір», якая цалкам складаецца з кампазіцый, створаных нашымі суайчыннікамі.

***— На прэс-канферэнцыі, прысвечанай праекту, прадстаўнік Мінгарвыканкама і мастацкі кіраўнік «Мінскканцэрта» Алена Радзівонава паабяцала, што сёлетняя праграма здзівіць нават дасведчаных знаўцаў музыкі. Дык чым яна выбітная — асабліва ў параўнанні з канцэртамі мінулых гадоў?***

— Праграма здзівіць разнастайнасцю і выбарам кампазіцый. Калі вы невялікі фанат класічнай музыкі, усё роўна знойдзецца вечар, дзеля якога палічыце вартым выйсці з дому. Вас таксама павінны скарыць аркестры. На адным з канцэртаў на сцэне будзе знаходзіцца больш за дзевяноста чалавек. Адзначу і той факт, што ў якасці салістаў запрошаны сусветныя зоркі опернай сцэны: сапрана з Расіі Ірына Крыкунова, мецa-сапрана з Беларусі Аксана Волкава, тэнар з Літвы Крысціян Бенедыкт, французскі барытон Аліўе Эт. На Радзіму з еўрапейскага музычнага тура вернуцца нашы суайчыннікі — індыкласічны музычны праект Nouvelle Philharmonie.

***— Ці не крыўдна вам як арганізатару, што ўвага наведвальніка будзе ўвесь час пераключацца з канцэрта класічнай музыкі на рознага кшталту спакусы цэнтра горада?***

— Мы спадзяёмся, што ў кожным кутку Верхняга горада будуць чутны гукі класічнай музыкі, якімі мы прыцягнем усіх меламанаў. А ў цэлым гэта не так страшна, бо праект праходзіць у дэмакратычным фармаце open air. У існуючым канкурэнтным полі ідзе сапраўдная бітва за наведвальніка, і галоўная зброя — гэта прадукт. Мы ў сваёй зброі ўпэўненыя.

***— Як Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр адзначыць сёння свой дзень народзінаў — у першую суботу «Класікі ля Ратушы»?***

— Народны артыст Беларусі — маэстра Аляксандр Анісімаў падрыхтаваў выдатную праграму з твораў знакамітых кампазітараў. Мы пачуем Вольфганга Амадзя Моцарта, Пятра Ільіча Чайкоўскага, Фрыдэрыка Шапэна, Джаакіна Расіні, Джакама Пучыні і шэраг іншых знакамітых кампазітараў. Сумесна з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь выступяць вядомыя салісты опернай сцэны — ужо згаданыя Ірына Крыкунова, Аксана Волкава, Крысціян Бенедыкт. Гэта будзе вялікі і цікавы канцэрт майстроў сваёй справы, гонару Беларусі.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Выстава

## Нерукатворнае і рукатворнае

«Храм» Усевалада Швайбы ў арт-прасторы «Высокае места»

**Калі дагэтуль вы не былі знаёмыя з творчасцю Усевалада Швайбы, то будзьце ўпэўнены: убачыўшы ўпершыню яго карціны і графіку, вы назаўсёды запомніце яго аўтарскі почырк. Мастак-эстэт, ён раскрывае душу праз адлюстраванне жаночых грацыёзных вобразаў, акцэнтуе ўвагу на целе чалавека, якое лічыць храмам, што ў любы момант можа быць альбо асветлены, альбо апаганены.**

На думку Усевалада Швайбы, адна з найважнейшых мэт чалавека — знайсці храм у сабе і берагчы яго ўсё жыццё. А калі так атрымаецца, што нехта яго знішчыць, — на месцы старога разбуранага храма «за тры дні ўзвесці іншы, нерукатворны». Гэтая ідэя аб'ядноўвае ўсе творы экспазіцыі.

Работы мастака, выстаўленыя ў сталічнай галерэі, захоўваюць у сабе матывы, агульныя для славянскай і антычнай міфалогіі. Майстар дэманструе захапленне жаноцкай прыгажосцю і абаяльнасцю. На яго палотнах намаляваныя жанчыны, у рысах якіх захоўваецца адначасова адсылкі да мінулага і цяперашняга часу. Тэматыка і тэхніка работ розныя. Ён займаецца як жывапісам, так і графікай, звяртаецца як да рэалістычнага жывапісу, так і да сюррэалізму, карыстаецца элементамі славянскай культуры. Гэта той выпадак, калі аўтар валодае не толькі звыштонкім адчуваннем рэчаіснасці, але і майстэрствам для перадачы свайго светаўспрымання.



Назва экспазіцыі «Храм» не толькі падказвае нам канцэпцыю выстаўкі, праз якую кожны чалавек можа задумацца пра сэнс жыцця, але ж і раскрывае мастака як філосафа. На выстаўцы ў большасці прадстаўлены графічныя творы мастака, якія варта дасканала разглядаць, абдумваць. Пасля прагляду думкі складваюцца, быццам бы пазлы, у агульную карціну. У гэтым і заключаецца аўтарская задума. Арганізатары ўдала сфарміравалі выстаўку: графічныя творы прадстаўлены на першым паверсе галерэі, а жывапісныя — на другім.



**Вікторыя АСКЕРА**

# Беларусь у аб'ектыве 1860-х

## Выстаўка артэфактаў мінулых стагоддзяў адкрылася ў Брэсце

**Выстаўка фотаздымкаў і графічных работ з калекцыі экс-міністра замежных спраў краіны Пятра КРАЎЧАНКІ адкрылася ў Мастацкім музеі — філіяле абласнога краязнаўчага музея. Былы кіраўнік МЗС Беларусі расказаў цікавую гісторыю набыцця 11 аўтэнтычных здымкаў італьянскага фотамайстра Тэафіла-Эўгеніюша Барэцi.**


Фота Марыі МІЦКЕВІЧ.

Барэцi, несумненна, можна назваць першым у гісторыі Беларусі фотадакументалістам. Больш за тое, паводле слоў Пятра Краўчанкі, яго можна лічыць не проста прафесіяналам, але бацькам беларускай, польскай, літоўскай фатаграфіі. Яшчэ ў далёкія 1860-я гады ён зрабіў здымкі гарадоў і мястэчак нашага краю. Зрабіў іх з вялікай любоўю, таму яны і сталі творамі мастацтва, якое не страчвае актуальнасць праз стагоддзі. Сярод работ майстра ёсць, напрыклад, знакаміты дуб у Туганавічах, дзе складаў лірычныя вершы Адам Міцкевіч. Пётр Краўчанка расказаў, што, калі паказаў старую і новую фатаграфіі з Туганавіч экс-прэзідэнту Польшчы Аляксандру Квасьнеўскаму, апошні быў вельмі расчулены. Міцкевічу прысвечаныя тры ўнікальныя фатаграфіі Барэцi.

Акрамя фотаработ на выстаўцы прадстаўлены тры гравюры, на якіх адлюстраваны прадстаўнікі роду Радзівілаў, тут жа ёсць унікальная гравюра асады Брэста шведамі ў 1657 годзе, фотапартрэт Элізы Ажэшкі ды іншыя творы.

Адкрыццё выстаўкі ў Мастацкім музеі наведаў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук. Экс-міністр Краўчанка звярнуў увагу кіраўніка Брэста на тое, што варта зрабіць захады для ўключэння святкавання 1000-годдзя горада ў каляндар ЮНЕСКА. У Брэсце ж адбыўся шэраг падзей, якія аказалі ўплыў на еўрапейскую палітыку і гісторыю. Мэр горада падзякаваў за прапанову і паабяцаў наввярстаць упушчанае пры складанні плана святкавання юбілею.

Варта сказаць, што выстаўка адбылася па ініцыятыве абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага. На мерапрыемстве з нагоды адкрыцця загаварылі пра назву ўстановы. Пётр Краўчанка лічыць, што бібліятэка магла б насіць імя Мікалая Радзівіла Чорнага, знакавай фігуры для Брэста, які заснаваў тут першую друкарню і выпусціў знакамітую Біблію.

Выстаўка будзе працаваць месяц. Такім чынам, можна сказаць, што экс-міністр Краўчанка працягвае дыпмісію, зараз — у культурным кірунку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## Творчых запрашаюць у Смаленск

**Калі вы маладыя і таленавітыя, то ў вас ёсць добрая магчымасць паўдзельнічаць у першым расійска-беларускім злёце творчай моладзі «У руху» на тэрыторыі Смаленскай вобласці.**

Як паведамілі ў адміністрацыі Смаленска, на злёт запрашаюцца расіяне і беларусы ва ўзросце ад 14 да 25 гадоў. У праграме запланаваны майстар-класы і абмен інфармацыяй па розных напрамках (танец, вакал, акцёрскае і прамоўніцкае майстэрства, музыка і гэтак далей). Выдаткі па харчаванні і пражыванні ўдзельнікаў бярэ на сябе Смаленская абласная грамадская арганізацыя Расійскага саюза моладзі.

Гэта мерапрыемства — працяг сумеснага расійска-беларускага маладзёжнага праекта, які стартаваў сёлета ў Смаленску пад назвай Фестываль сучаснай творчасці «Насустрач да зорак». Ён накіраваны на ўмацаванне і пашырэнне двухбаковага супрацоўніцтва, падтрымку і папулярызацыю сучаснага мастацтва сярод моладзі Расіі і Беларусі, стварэнне ўмоў для прасоўвання крэатыўных творчых праектаў падрастаючага пакалення.

Злёт творчай моладзі будзе праходзіць з 7 па 11 жніўня, але заяўку для ўдзелу ў ім неабходна запоўніць да 15 ліпеня. Для гэтага трэба зайсці на афіцыйны сайт мерапрыемства http://рсм67.рф

Там жа размешчана дадатковая інфармацыя аб падзеі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

---

■ На сцэне

# НАВОШТА?

## Ці апраўдвае Рускі тэатр працягласць сваіх пастановак?

**Дзве гадзіны сорак пяць хвілін давялося глядзець новы спектакль драматычнага тэатра імя Горкага «Падводнікі», заснаваны на рэальных падзеях — аварыі на рэактары савецкай атамнай падводнай лодкі К-19. Аўтары пастаноўкі бытцам паспрабавалі стварыць на гэтай лодцы — у адасобленай закрытай прасторы — зрэз чалавецтва, якое аказваецца сам-насам з катастрофай і ў гэтых умовах пэўным чынам сябе праяўляе. Толькі назвалі гэтую прастору Расіяй (а «Расія найлепшая за ўсіх»), пабудавалі яе на штампах і не здолелі актуалізаваць, нават са знакамі «радыяцыя». Прэм'ера адбылася ў Рускім тэатры 30 чэрвеня, і тыя амаль тры гадзіны прагляду не далі зачэпкі для разумення: навошта гэты спектакль з'явіўся на сучаснай сцэне?**



Ідэя пабудаваць тэатральную пастаноўку пра здарэнне на К-19 належыць рэжысёру і мастацкаму кіраўніку Рускага тэатра Сяргею Кавальчыку, які замовіў п'есу Андрэю Курэйчыку і стаў рэжысёрам «Падводнікаў». У выніку атрымалася гісторыя пра аварыю на «гонары савецкага флота» і подзвіг мічмана Васіля Міцкевіча, па нацыянальнасці беларуса, які «нырнуў» у радыеактыўнае пекла лодкі дзеля магчымасці ўспліць і выратаваць экіпаж.

З той нагоды, што аварыя не можа стаць для гледача сюрпрызам, драматург настойліва яе прадказвае — перамяшчэннем у часе, драматычнай акцэнтаванай просьбай жонкі Васіля вярнуцца, працівагазам, які з'яўляецца на падводнай лодцы па прынцыпе чэхаўскага ружжа, якое не можа не стрэліць. Таму з трагедыі спектакль пачынаецца, ёй працягваецца і на ёй канчаецца, што, вядома ж, трэба абыграць цікавасцю «начынкі» і, трэба сказаць, аўтары абыгралі — сентыментальна, літаральна і заштампавана.

Амаль усё дзеянне адбываецца ў 1960-х на двух паверхах зрэзу падводнай лодкі (дэкарацыі і касцюмы, магчыма, — галоўная вартасць «Падводнікаў») — тут збіраецца інтэрнацыянальны састаў гатовых на подзвігі мужчын, што трапілі сюды ці то працягваючы дынастыю, ці то з-за рамантычных уяўленняў пра мора. Кіраўніцтва і ваенныя маракі знаходзяцца адпаведна на верхнім і ніжнім паверхах, але згодна з задумай аварыя і верагоднасць затаплення зраўняе іх паміж сабой.

Аўтары «аздобілі» сюжэт паралельнымі лініямі — паказалі жонак, што чакаюць мужоў; «здрадніцу», якая не чакае; вышэйшае кіраўніцтва, што баіцца за свае пагоны; небяспеку, што ідзе ад радыяцыі; нампаліта, які ад страху памерці цалуе ікону. Задалі пытанне, ці варта рызыкаваць сваім жыццём і будучыняй дзеля палітычных амбіцый на прыкладзе К-19 падчас халоднай вайны. Далі ў спектакль крыху містычнага, паказалі той свет.

Зразумела, што такія творчыя амбіцыі (ці тэатральнае графаманства) расцягнуліся амаль на тры гадзіны, хоць пытанне «навошта?» у дачыненні да апраўданасці існавання пастаноўкі ўсё яшчэ стаіць. Нягледзячы на багацце сюжэтных ліній і дадатковых матываў, вечных пытанняў, што агучваюцца акцёрамі (накшталт «калі мы такія разумныя, што ж жывём так пагана?»), нічога нова ў «Падводніках» няма. Больш за тое, тут складана знайсці нешта актуальнае, апроч туманнай спасылкі на небяспеку праз міжнародны знак радыяцыі.

Калі няма ні навага, ні актуальнага, гэта павінна быць бліскуча пастаўлена, каб глядач смакаваў кожны момант. Шчыра кажучы, я чакала толькі, калі пастаноўка «прывяжацца» да сучаснасці, і гэта было для мяне галоўнай інтрыгай. Аўтары ж сапраўды паспрабавалі зрабіць пастаноўку калі не інтрыгуючай, не новай, не актуальнай, то эмацыянальна насычанай. Такім шляхам на мінскай тэатральнай сцэне ў выглядзе «Падводнікаў» з'явілася меладрама, прычым у кіношным ключы, як бы гэта ні здавалася дзіўным. Відавочна, мысленне аўтара п'есы Андрэя Курэйчыка, які з'яўляецца таксама кінасцэнарыстам і кінарэжысёрам, зацыклілася на кінаштампах і магчымасцях фільмаў выжымаць эмоцыі, калі казаць пра абыгрыванне сюжэтных паваротаў і паводзін герояў. Ці не натхняўся ён увогуле фільмам Кэтрын Бігелоу, які так і называецца «К-19», дзе галоўную ролю выконвае Харысан Форд?



У выніку «Падводнікі» бачацца мне спекуляцыяй у мастацтве — творам, дзе выкарыстана гістарычная падзея, якая нейкім чынам датычыцца вялікай колькасці людзей (тут спрацоўвае агульнае савецкае мінулае, халодная вайна, гонар былой дзяржавы), і на гэтым матэрыяле створана нешта сентыментальнае, відовішчнае і абавязкова пачуццёвае.

Што дакладна не перашкодзіла б сюжэту — гэта схематычнасць. У «Падводніках» жа наадварот — усё літаральна, эмацыянальна, тэатральна, катэгарычна і бескампрамісна (гэты добры, а іншы — здраднік). Затое, побач з некаторым уздзеяннем кінематографа на пастаноўку, у «Падводніках» выдатна — тэатральна — арганізавана прастора сцэны, тонка і знаходліва абыграна вяртанне з будучыні ў час дзеяння асноўнай часткі спектакля і ролі выкананы добра (дарэмна толькі прымусілі Васіля Міцкевіча ў выкананні акцёра Руслана Чарнецкага геройна корчыцца ад апрамянення радыяцыяй). А радыяцыя, як было «ёскраметна» сказана ў пачатку пастаноўкі, «пранікае ў цэбе цераз цэбе» — і гэта адзіная актуальнасць, якую можна пастарацца знайсці ў «Падводніках»...

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления**

| №лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Апартамент №001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь –101,2 кв. м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот №2 | Апартамент №002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 59,7 кв. м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот №3 | Апартамент №003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 61,2 кв. м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот №4 | Апартамент №004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 99,6 кв. м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот №5 | Апартамент №101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 101,7 кв. м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот №6 | Апартамент №104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 100,8 кв. м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот №7 | Апартамент №201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №8 | Апартамент №202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв. м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот №9 | Апартамент №203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №10 | Апартамент №204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв. м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот №11 | Апартамент №205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №12 | Апартамент №206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №13 | Апартамент №208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №14 | Апартамент №209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв. м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот №15 | Апартамент №210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №16 | Апартамент №211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №17 | Апартамент №301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №18 | Апартамент №302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №19 | Апартамент №303 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №20 | Апартамент №305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №21 | Апартамент №306 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №22 | Апартамент №308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №23 | Апартамент №309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №24 | Апартамент №310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №25 | Апартамент №311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №26 | Апартамент №401 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №27 | Апартамент №402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №28 | Апартамент №403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №29 | Апартамент №404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв. м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот №30 | Апартамент №405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 717, 10 |
| Лот №31 | Апартамент №408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №32 | Апартамент №409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №33 | Апартамент №410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №34 | Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №35 | Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №36 | Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №37 | Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №38 | Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 171,10 |
| Лот №40 | Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №41 | Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
